Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

29 ЖНІЎНЯ 2020 г. СУБОТА № 168 (29282)

АВАНТУРЫ ПРАЦЯГВАЮЦЦА... урывак з рамана людмілы рублеўскай 9

НАВОШТА ЖЫЛЛЮ ДЫЗАЙН, ДЗЕ НЕЛЬГА НІЧОГА ЧАПАЦЬ? 12

ЛІЧБА ДНЯ

Больш чым на 90 %

выкананы дзяржзаказ па збожжы. Пастаўлена 752,6 тысячы тон збожжа ў лік дзяржзаказу, што складае 92,7 % ад плана. Усяго па краіне намалочана 7,63 млн тон збожжа пры сярэдняй ураджайнасці 37,2 ц/га (у 2019 годзе ўраджайнасць на аналагічную дату складала 31,2 ц/га). У Мінскай вобласці сабралі больш за 1,9 млн тон збожжа, Гродзенскай — 1,5 млн тон, Брэсцкай — больш за 1,3 млн тон і больш як па 900 тыс. тон — у Магілёўскай, Віцебскай і Гомельскай абласцях.

КАРАТКА

• Мёрскі металапракатны завод выпусціў першую таварную прадукцыю.

• Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны запрашае пазнаёміцца з новымі праектамі.

• Забарона на наведванне лясоў знята на ўсёй тэрыторыі Беларусі.

• «Малочка» забяспечвае больш за 40 % экспарту беларускай сельгаспрадукцыі.

• Апараты камп'ютарнай тамаграфіі з'явіліся ў дзевяці сталічных паліклініках.

• Сістэмы відэаназірання да пачатку навучальнага года ўстанавілі ў 13 школах Гомельскай вобласці.

• У новым мікрараёне Ліды ўсе дамы абсталююць электраплітамі.

• Сістэму пошуку «Работа без межаў» ствараюць у ЕАЭС.

• Тры аўтамабілі гарэлі ноччу на вуліцы Маякоўскага ў Мінску. Адна з версій здарэння, якія разглядаюцца, — падпал.

РАСКЛАД НА ЗАЎТРА

Фота БелТА.

Школа № 1 адкрыецца ў вёсцы Копішча, што ў Мінскім раёне («Новая Баравая»). Яе ўжо называюць «школай будучыні». Сюды прыйдзе вучыцца больш за 1800 дзяцей.

Прыватная гаспадарка

«БЕЛАЕ ЗОЛАТА» КАМУНАРАЎ

На тэрыторыі сельсавета налічваецца 250 кароў без уліку іншай жыўнасці

Камунараўскі сельсавет, што ў Любанскім раёне на Міншчыне, мяжуе з Гомельскай вобласцю. Ад райцэнтра ён знаходзіцца на адлегласці 25 кіламетраў. Тут пражывае 2860 чалавек. На тэрыторыі сельсавета ў асабістых дапаможных гаспадарках налічваецца 250 кароў. Не ў кожным раёне не толькі Мінскай вобласці, але і краіны ў цэлым, знойдзеш такі прыватны статак пагалоўя. Калі старшыня сельвыканкама Мікалай ДУДЗІК расказвае пра гэты факт падчас сустрэч са сваімі калегамі з іншых рэгіёнаў, яны шчыра здзіўляюцца.

Сапраўды, на пад'ездзе да вёскі Камунары заўважаю статак кароў, што скубуць траву на беразе ракі Арэса. Шмат у якіх дварах чароды гусей, качак, індыкоў, курэй.

— Людзі ў нашым сельсавеце вельмі працавітыя, трымаюць вялікую хатнюю гаспадарку, — кажа Мікалай Мікалаевіч. — Акрамя буйной рагатай жывёлы, яшчэ і коз, парсюкоў. У многіх ёсць коні. Малако здаюць дзяржаве. Напрыклад, Святлана Носікава за сем месяцаў прадала 21 337 літраў, Марына Лапцік — каля 21 000, Вольга Хамлюк — каля 14 000, Раіса Дудзік — 8186, Ларыса Сулім — 8109, Тамара Хомец — 7552 літра малака.

СТАР. 5

Арэнда жылля

Цэннікі леташнія, але гаспадары згодныя на зніжкі

Жнівень у сталіцы традыцыйна быў месяцам, калі зняць кватэру ў горадзе амаль немагчыма. Тэлефоны кватэр і агенцтваў у гэтыя дні звычайна абрывалі будучыя студэнты і іх бацькі, выпускнікі і маладыя спецыялісты, турысты і замежныя бізнесмены. З прычыны пандэміі багатыя турысты ўжо не складаюць канкурэнцыю. Затое ў горад прыехала шмат першакурснікаў. Мы пастараемся дапамагчы ім у пошуку таго самага «свайго» жылля.

Свабодных кватэр стала больш

Летні час — заўсёды гарачы сезон для рынку арэнды. Гэтае лета, нягледзячы на ўсе знешнія прычыны, не стала выключэннем. Калі ў чэрвені мы ўсё яшчэ адыходзілі ад крызісу, звязанага з COVID-19, то ўжо ў ліпені сітуацыя нармалізавалася. Навіны пра пандэмію адышлі на другі план, людзі прывыклі да тых цэннікаў, якія сфарміраваў рынак. Потым назіралася павелічэнне попыту як на загарадную нерухомасць (дачы і катэджы ў арэнду), так і на кватэры ў Мінску.

СТАР. 7

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 20168

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Гэтая вакханалія заканчваецца, трэба займацца эканомікай»

Прэзідэнт Беларусі падчас рабочай паездкі наведаў Оршу і прадпрыемства па вытворчасці сыроў ТАА «Савушкін-Орша»

Аляксандр Лукашэнка падкрэслівае, што ў першую чаргу пры вырашэнні пытанняў работы тых ці іншых прадпрыемстваў яго хваляюць людзі, работнікі вытворчасцяў і іх зарплаты, — перадае прэс-служба кіраўніка краіны.

Прэзідэнту расказалі пра работу прадпрыемства «Савушкін-Орша» і перспектывы яго развіцця. Вытворчасць паступова нарошчвае магутнасці, то-бок, мае патрэбу ў дадатковых рабочых руках і ў сыравіне. Тое, што спадзяванні на вырашэнне апошняга пытання аптымістычныя, пацвярджаюць рэчаіснасць і лічбы.

Але разам з тым у Оршы дзейнічае яшчэ і завод плаўленых сыроў, які мае істотныя даўгі. Людзі цяпер там атрымліваюць зарплату ў сярэднім на траціну ніжэйшую, чым у ТАА «Савушкін-Орша». Было адзначана, што ёсць магчымасць працаўладкаваць спецыялістаў на новае прадпрыемства, забяспечыўшы рост іх даходаў. Больш за тое, вызваліцца пэўны аб'ём сыравіны. Аляксандр Лукашэнка даручыў да канца года дэталёва прапрацаваць гэтае пытанне, вырашыць, што рабіць з абавязацельствамі, за кошт якіх крыніц іх пагашаць.

«Мяне хвалююць людзі, — сказаў Прэзідэнт. — Мы не павінны людзей кідаць. Сядайце і вырашайце гэта пытанне. Мы павінны з 1 студзеня працаваць так, як трэба. Аж да таго, што, калі трэба будзе, задзейнічаць Магілёўскую вобласць».

Наведваючы ТАА «Савушкін-Орша», Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся, якія прадпрыемствы ў вобласці працуюць на такім жа ўзроўні, як гэта вытворчасць. На думку Прэзідэнта, ***паміж дзяржаўнымі прадпрыемствамі і прыватнымі не павінна быць розніцы: усюды павінна быць наладжана эфектыўная работа, павінны выкарыстоўвацца сучасныя тэхналогіі і, як вынік, дасягацца высокія вынікі.*** Усе вытворчасці павінны працаваць у роўных умовах. «Каб у нас не было спрэчак: гэтая вакханалія заканчваецца, трэба займацца эканомікай. Вось той узровень, на які мы павінны выйсці, — заявіў Прэзідэнт. — Нам трэба ставіць прадпрыемствы ў роўныя ўмовы, пачынаючы з сыравінных зон. Адзіная папраўка: мы будзем рабіць акцэнт на надзейнасць і адданасць дзяржаве — не Лукашэнку. Каб не дапусціць таго, што адбылося цяпер. У вас у пераважнай большасці прыватнікі пачалі хістацца. І не проста хістацца — многія подла сябе паводзяць».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што за сваё меркаванне ў Беларусі не пачнуць «ламаць людзей».

Орша павінна пачынаць выкарыстоўваць больш уласных рэсурсаў для развіцця раёна. «Выхваляцца пакуль няма чым. Вы пакуль жывяце за кошт дзяржавы, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Вы не думайце, што мы Оршу будзем несці на плячах і наступную пяцігодку. Тут ужо вам трэба будзе круціцца на ўсю катушку».

Старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай Шарснёў расказаў Прэзідэнту, што ў цэлым сітуацыя ў рэгіёне не мяняецца, вобласць працуе стабільна, сацыяльна-эканамічная сітуацыя не напружаная.

Падчас наведвання ТАА «Савушкін-Орша» Аляксандр Лукашэнка пагутарыў з працоўным калектывам і журналістамі. Работнікам ён расказаў пра сваю пазіцыю па развіцці раёна. «Вельмі шмат зроблена для гэтага горада. Не таму, што гэта мая малая радзіма, а таму, што гэта быў прыклад для такіх жа гарадоў (Барысава, Маладзечна, Баранавіч і іншых), як мы будзем іх развіваць», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Размаўляючы з работнікамі прадпрыемства, Прэзідэнт паабяцаў адказаць на ўвядзенне санкцыйных мер з боку шэрагу краін.

«Вось мы ім зараз пакажам, што такое санкцыі. Калі яны яшчэ ў Кітай і Расію цераз нас (палякі і літоўцы) баражыравалі, цяпер яны будуць лётаць або цераз Балтыку, або цераз Чорнае мора гандляваць з Расіяй і іншае. А па санкцыйнай прадукцыі (на тую прадукцыю, на якую Расія ўвяла эмбарга) — хай нават не мараць. Мы ім пакажам, што такое санкцыі, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Яны заелі і забыліся, што такое Беларусь. І думалі, што нас можна нахіліць, танкамі папалохаць, ракетамі... Паглядзім, хто каго яшчэ напужае».

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што даручыў ураду ўнесці прапанову аб пераарыентацыі ўсіх гандлёвых патокаў з партоў Літвы на іншыя.

«Трэба ўціхамірыцца, і ім таксама, за мяжой, узяць галаву ў рукі, супакоіцца і падумаць, у што можа ператварыцца Еўропа, калі тут палыхне», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Паводле яго слоў, Беларусь можа ператварыцца ў тэатр ваенных дзеянняў, дзе «будуць вырашацца не нашы пытанні». «Ім не Беларусь патрэбна. Беларусь — гэта трамплін, як звычайна, у Расію. Толькі не так, як Гітлер групу армій «Цэнтр» кінуў на Маскву. Тэхналогіі іншыя. Трэба зламаць гэтую ўладу, якая ёсць, падсунуць іншую, якая звернецца да замежнай дзяржавы, каб ўвялі войскі і аказалі падтрымку», — сказаў Прэзідэнт, дадаўшы, што Беларусь разглядаюць як рынак, дзе яны будуць гандляваць сваёй прадукцыяй.

Як расказаў Аляксандр Лукашэнка, існуе ваенная пагроза: «І тое, што я вас напружваю зараз з нагоды гэтых гусеніц, танкаў на тэрыторыі Польшчы і Літвы, дык слухайце, мы ж не ідыёты. Былі пад Берлінам амерыканскія F-16. Ну і хай стаяць там. Не, яны іх перакінулі сюды — 15—20 хвілін падлёту да нашай тэрыторыі. Для мяне гэта як для галоўнакамандуючага пытанне», — сказаў Прэзідэнт.

Прэзідэнт параўнаў сучасную сітуацыю з пачаткам Вялікай Айчыннай вайны, калі Чырвоная армія аказалася не гатовая адбіць агрэсію. «Я вучыў гісторыю добра і ведаю гэта. Таму раблю высновы. Для мяне гэта быў урок. Таму я вымушаны быў палову арміі прывесці ў поўную баявую гатоўнасць і разгарнуць, акружыць фактычна Гродна, каб яны не глядзелі на гэтую нашу жамчужыну», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Доля малочнай прадукцыі ў экспарце сельгаспрадукцыі і прадуктаў харчавання складае 43,3 %, паведаміў карэспандэнту БелТА **начальнік галоўнага ўпраўлення знешнеэканамічнай дзейнасці Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Аляксей БАГДАНАЎ.**

Экспарт малака і малочнай прадукцыі ў студзені—чэрвені склаў $1,179 млрд. Пастаўкі выраслі на 6,9 % у параўнанні з першым паўгоддзем 2019 года. У натуральным выражэнні экспарт павялічыўся на 5,8 %, у тым ліку сыроў і тварагу — на 10,1 %, сухога неразведзенага малака — на 1,3 %, малака і згушчаных вяршкоў — на 30,2 %, сухой малочнай сыроваткі — на 24,3 %. Беларуская малочная прадукцыя ў першым паўгоддзі была экспартаваная ў 47 краін.

За 2019 год сярэдні надой малака па краіне ад каровы склаў 5039 кг, што на 275 кг больш, чым у 2015 годзе. За студзень—чэрвень гэтага года паказчык прадукцыйнасці дойнага статка перавысіў леташні ўзровень на 142 кг і склаў 2647 кг.

Пры гэтым, па інфармацыі Белстата, экспарт найважнейшай прадукцыі (малака, вяршкоў згушчаных, нязгушчаных, сухіх, масла, сыру і тварагу) летась склаў у суме 738,5 тысячы тон. Значна дадалі ў параўнанні з 2018 годам сыры і тварог.

Прэзідэнт расказаў, як звязаўся з Прэзідэнтам Расіі. «У нас дагавор. Кажу: давай думаць, што будзем рабіць. Ён кажа: мы ведаем, чаго яны хочуць. І Пуцін ужо прайшоў некалькі такіх этапаў ад чачэнскай вайны і ведае, што адбываецца вакол межаў. І мы з ім дамовіліся. Мы справімся з гэтай праблемай. Але калі там тузануць, за межамі, трэба задзейнічаць сумесную групоўку ўзброеных сіл, асноваі якой з'яўляецца беларуская армія. А расіяне нас павінны падтрымліваць і рухацца за намі».

Такімі дзеяннямі Расія ратуе не столькі Беларусь, бо пагроза ёсць і ў дачыненні да яе. Прэзідэнт Беларусі, адказваючы на пытанні журналістаў у Оршы, пракаментаваў сваё прыняцце першай прэзідэнцкай прысягі пад белчырвона-белым сцягам, перадае карэспандэнт БелТА. ***«Мяне за гэта не трэба крытыкаваць. Разумны чалавек скажа: Прэзідэнт законапаслухмяны. Тады быў такі сцяг, усталяваны Вярхоўным Саветам*** (мы не галасавалі за гэтую сімволіку, але большасцю яна была прынятая пад ціскам нашых нацыяналістычных дэпутатаў), — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Ніякай канспіралогіі. Інакш я тады паступіць не мог. Я павінен быў быць Прэзідэнтам для ўсіх і законапаслухмяным. Я так і рабіў».

Кіраўнік дзяржавы пракаментаваў і ціск на дэпутатаў, падкрэсліўшы, што ўлада зможа абараніць іх. «Ужо пачалі не проста іх запалохваць, а на некаторых накатваць. Мы гэта не проста бачым — мы ведаем, хто гэта робіць, і разбярэмся з імі. Прэзідэнт на тое і Прэзідэнт, выведзены над галінамі ўлады, каб не толькі кантраляваць, але і абараняць», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Беларусь першая атрымае расійскую вакцыну ад каранавіруса. Пра гэта дамовіліся прэзідэнты дзвюх краін, расказаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

«Мы дамовіліся з Пуціным. Уладзімір Уладзіміравіч сам прапанаваў нам гэты варыянт. Яны ўжо прайшлі два этапы. Я яму чаму веру: ён на сваёй сям'і выпрабавае гэтую вакцыну», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Мікалай Шарснёў падняў пытанне аб харчаванні ў дзіцячых садках, якія знаходзяцца ў сельскай мясцовасці. На яго думку, яно павінна быць бясплатным, як і ў школах. «Харчаванне школьнікаў на сяле бясплатнае, а ў дзіцячым садку, атрымліваецца, платнае. Гэта значыць дзецюкоў у 10—11-м класе мы бясплатна кормім, а дзетак — платна», — звярнуўся ён да Прэзідэнта.

«Добра, давайце паглядзім на харчаванне дзяцей у дзіцячых садках. Мы ў цэлым вывучым праблему (і сяло, і горад), параімся са старшынямі рай-, гар- і аблвыканкамаў», — сказаў Прэзідэнт на завяршэнне.

Ва ўрадзе

СПОРТ І ТВОРЧАСЦЬ ЯК АЛЬТЭРНАТЫВА «ПЛОШЧЫ»

У Саўміне абмеркавалі ўдзел непаўналетніх у несанкцыянаваных мерапрыемствах

Адбылося пасяджэнне Камісіі па справах непаўналетніх пры Савеце Міністраў па адпаведнай тэме. За апошнія два тыдні амаль 700 непаўналетніх па кране былі выкрыты ва ўдзеле ў незаконных мерапрыемствах. Ужо разгледжаны ці знаходзяцца ў працэсе разгляду 232 адміністрацыйныя правапарушэнні, што датычацца актыўнага ўдзелу падлеткаў у адпаведных акцыях. Пра гэта журналістам расказаў намеснік прэм'ер-міністра Ігар Петрышэнка.

«Я вельмі хацеў бы папрасіць усіх бацькоў, каб яны глядзелі за сваімі дзецьмі, не дапускалі парушэння дзеючага заканадаўства ў дачыненні да ўдзелу ў рознага кшталту сумнеўных мерапрыемствах, якія несанкцыянаваны і дзе не гарантуецца бяспека дзяцей», — сказаў Ігар Петрышэнка.

Па яго словах, часам бацькі свядома стымулююць удзел у такіх мерапрыемствах сваіх дзяцей. У прыклад ён прывёў факт, калі маленькі хлопчык ішоў па раздзяляльнай паласе дарогі падчас адной з акцый. Асноўная небяспека ўдзелу падлеткаў і дзяцей у несанкцыянаваных мерапрыемствах — стыхійнасць, неарганізаванасць акцый, немагчымасць гарантаваць бяспеку ўдзельнікаў.

«Я хацеў бы нагадаць, што ёсць Канвенцыя па правах дзіцяці і дзяржава ўзяла на сябе адказнасць забяспечваць бяспеку дзяцей, якія пражываюць на тэрыторыі нашай краіны. Гэта не толькі абавязак бацькоў, але і дзяржавы. Калі бацькі па нейкіх прычынах не могуць забяспечыць бяспеку свайго дзіцяці і свядома штурхаюць яго на правапарушэнне, яны ў адпаведнасці з нашым заканадаўствам падлягаюць адміністрацыйнай адказнасці», — дадаў намеснік прэм'ера.

Сярод мер профілактыкі ўдзелу моладзі ў акцыях і мітынгах — загрузка школьнымі заданнямі, уцягненне ў актыўную спартыўную, культурную, грамадскую дзейнасць. Асабліва да такіх заняткаў плануюць заахвочваць падлеткаў, схільных да правапарушэнняў.

«Станоўчыя вынікі такой работы ўжо ёсць. І мы далей плануем нарошчваць міжведамаснае ўзаемадзеянне. Спыненне правапарушэнняў — гэта не толькі пытанне камісій па справах непаўналетніх і праваахоўнай сістэмы, а, канешне ж, прафілактычная работа і Міністэрства адукацыі з усім інструментарыем, інстытутамі, вучэбнымі ўстановамі, і праца педагогаў, і Міністэрства спорту і турызму, і іншых зацікаўленых, якія ўцягнуты ў выхаванне нашых дзяцей», — падкрэсліў ён.

Ігар Петрышэнка адзначыў, што грамадска-палітычныя падзеі ў краіне аказалі сур'ёзны ўплыў на грамадзян месенджараў і Telegram-каналаў. Паводле яго слоў, для многіх такія каналы інфармацыі становяцца асноўнай крыніцай навін.

«Такія «крыніцы інфармацыі» з'яўляюцца інструментам стварэння негатыўных інфанагод, запускання асоб, якія падтрымліваюць дзяржаву, пастаяннага ўкідвання фэйкаў, якія распаляюць незадаволенасць грамадзян. Відавочна, што сёння адбываюцца сур'ёзны інфармацыйны ціск, маніпуляванне грамадскай свядомасцю ў спробах дыскрэдытаваць уладу і праваахоўныя органы. Супрацьдзейнічаць месенджарам, як вы маглі ўпэўніцца, няпроста», — канстатаваў намеснік кіраўніка ўрада.

Ігар Петрышэнка заявіў, што Telegram прыцягвае карыстальнікаў прастатой, рэпутацыяй абароненай ад узлому платформы, гарантыяй поўнай ананімнасці. Таму яго актыўна асвойваюць маладыя людзі ў пошуках зносін і незалежнасці.

«Менавіта лозунгі з Telegram-каналаў накіраваны на фарміраванне пачуцця змен у грамадстве. І многія, у першую чаргу моладзь, натхняюцца такімі ідэямі. У рэчаіснасці аўтары гэтых платформаў у сваіх карысных інтарэсах зацікаўлены простай маніпуляцыяй падзеямі і фарміраваннем масавых пратэстаў. Асаблівую заклапочанасць выклікае ўцягванне падлеткаў у антыграмадскую ці дэструктыўную супрацьпраўную дзейнасць», — падкрэсліў намеснік прэм'ер-міністра.

Марыя ДАДАЛКА.

Педсавет

ІГАР СЕРГЕЕНКА:

«АДУКАЦЫЯ ПАВІННА ЗАСТАВАЦЦА ПА-ЗА ПАЛІТЫКАЙ»

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта прыняў удзел у абласной педагагічнай канферэнцыі ў Магілёве

— Педагагічная грамадскасць павінна сканцэнтравацца выключна на прафесійнай дзейнасці — адукацыя па-за палітыкай, — з гэтымі словамі звярнуўся да прысутных падчас абласнога педсавета кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Ігар СЕРГЕЕНКА.

На традыцыйную педагагічную канферэнцыю ў зале абласнога Палаца культуры сабралася каля тысячы кіраўнікоў устаноў адукацыі і педагогаў вобласці. Мінулы год, нягледзячы на тыя складанасці, якія былі выкліканы распаўсюджваннем каранавіруса, быў плённы. Па выніках 2019/2020 навучальнага года 68 % школьнікаў маюць высокі ўзровень ведаў, сярэдні паказчык атэстата 8,5 бала і вышэй мае 31 % выпускнікоў сярэдняй школы, атэстаты з залатым і сярэбраным медалямі атрымаў 341 выпускнік. На рэспубліканскім этапе алімпіяды па навучальных прадметах у агульным рэйтынгу сярод абласцей каманда Магілёўскай вобласці заняла 1-е месца, на яе рахунку 36 дыпломаў.

— Мне прыемна, што Магілёўшчына займае лідзіруючае месца ў адукацыйнай сферы, — адзначыў Ігар Пятровіч. — Я падтрымліваю прапанову губернатара вобласці аб заахвочванні дзяржаўнымі ўзнагародамі тых настаўнікаў, якія падрыхтавалі выдатнікаў. Самы галоўны здабытак — гэта кадры, гэта вы і тыя, хто рыхтуюць школы да новага навучальнага года.

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта адзначыў, што адна са складаных задач, якую прыйдзецца вырашаць у будучым, — гэта ўдасканаленне ўступных экзаменаў у ВНУ.

— Сістэма тэсціравання, якая рэалізуецца на працягу больш чым 10 гадоў, паказала сябе з найлепшага боку, але ёсць і праблема, — падкрэсліў выступоўца. — На этапе паступлення ў ВНУ, мы, як казаў Прэзідэнт, не бачым чалавека, як ён можа разважаць, думаць, размаўляць. Магчыма, не спатрэбіцца нешта кардынальна мяняць, проста працэс дапоўніцца жывымі зносінамі. Над вырашэннем гэтай задачы цяпер працуе Міністэрства адукацыі.

Ігар Сергеенка таксама нагадаў, што зараз вырашаецца пытанне аб паляпшэнні ўмоў работы настаўнікаў і аплаты іх працы.

— Я згодны з тымі пасыламі, якія ідуць з месцаў. Настаўнікі павінны быць максімальна разгружаны ад бюракратычных працэдур, ад празмернай валакіты, ад пісаніны, справаздачнасці, празмерных праверак, — падкрэсліў ён. — Калі мы з гэтага будзем зыходзіць, у вас застанецца больш часу для жывой работы з дзецьмі і бацькамі. Сёння трэба падняць і ролю класнага кіраўніка, і не толькі заклікам, але і матэрыяльным стымуляваннем. Не буду рабіць галаслоўных абяцанняў, але гэта пытанне знаходзіцца ў прапрацоўцы.

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта не абышоў бокам і тую складаную палітычную сітуацыю, у якой апынулася краіна:

— Адукацыя павінна быць выхаваўчай. Мы сёння шмат кажам пра моладзь, яна крыху інфантыльная, бо выросла ў стэрыльных умовах. Яна не бачыла тых складанасцяў на разломе канца 80-х — пачатку 90-х. Сёння знешнія сілы спрабуюць парушыць, пасеяць недавер паміж людзьмі. І гэты боль, пачуццё нявызначанасці пасяліліся ў сэрцах многіх нашых суайчыннікаў. Але мы не павінны даць сябе раскалоць на два лагеры. Недзяржаўныя СМІ зусім не паказваюць, хто правакаваў тыя масавыя беспарадкі, якія адбываліся ў Мінску. Актыўныя ўдзельнікі мітынгаў — моладзь, у тым ліку старшакласнікі і студэнты ВНУ. Падыход у нас павінен быць адзіны: тлумачыць, выхоўваць. Сёння мы перажываем самы няпросты перыяд у гісторыі нашай суверэннай Беларусі, і ад нашай пазіцыі, вашай, паважаныя педагогі, паколькі вы эліта грамадства, залежыць будучае краіны.

Старшыня Магілёўскага абл-выканкама Леанід ЗАЯЦ адзначыў, што настаўніцкая канферэнцыя — гэта добрая магчымасць падвесці вынікі мінулага года і паставіць задачы на будучыню, ацаніць, у які час мы жывём і працуем, якія павінны зрабіць крокі, каб у нашай краіне былі мір і спакой.

— На настаўніках сёння ўскладаюцца вялікія надзеі, бо яны займаюцца выхаваннем чалавека, грамадства, — падкрэсліў губернатар. — Мы не маем карысных прыродных рэсурсаў, у нас няма нафты, алмазаў, золата, але беларускі народ не выжывае, а жыве. І гэта трэба захаваць. Знешнія сілы жадаюць забіць клін паміж народам і ўладай. Але не можа краіна стабільна развівацца, калі ёсць варожасць. Разбурыць проста, а вось захаваць цяжка.

Таксама ў рабоце абласной педагагічнай канферэнцыі прымалі ўдзел прадстаўнікі Міністэрства адукацыі, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, кіраўнікі ВНУ, настаўнікі. Яны казалі пра тое, што трэба прыкласці ўсе намаганні для выхавання маладога чалавека будучага. Чалавека думаючага і прымаючага рашэнні самастойна, а не пад уздзеяннем маніпулятараў чалавечай свядомасцю звонку.

Напрыканцы сустрэчы Ігар Сергеенка перадаў настаўніку фізікі магілёўскага абласнога ліцэя № 1, народнаму настаўніку Рэспублікі Беларусь Валерыю Барашкову віншаванні з 70-годдзем ад Прэзідэнта Беларусі.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Акцыя

Трывога і боль жанчыны

На пляцоўцы перад сталічным універмагам «Беларусь» прайшоў мітынг «Жанчыны за адзінства і мір», які арганізаваў Беларускі саюз жанчын.

Тут працаваў адкрыты мікрафон, дзе дзяўчаты і жанчыны змаглі выказаць сваю пазіцыю, адносіны да тых падзей, што апошнім часам адбываюцца ў Беларусі. Выступілі дэпутаты, настаўнікі, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый. Яны казалі пра тое, што хочуць жыць у мірнай краіне і што бяспека на вуліцах нашых гарадоў вышэй за ўсё. «Сёння мы павінны аб'яднацца, стварыць утульнасць у нашых сем'ях, нашым агульным доме, якім з'яўляецца Беларусь.

— Я ніколі не думала, што мы, жанчыны, збяромся тут. Нас разрываюць трывога і боль. Перад першым верасня я не бачу на вуліцах школьных базараў, не чую смеху людзей, таму што ўсім страшна за сваіх дзяцей, блізкіх. Мы, жанчыны, заўсёды чуем ад нашых дарагіх мужчын, што мы захавальніцы дамашняга ачага, ствараем утульнасць у доме.

У нашым агульным доме — Беларусі — пасялілася непаразуменне. І толькі мы самі зможам зрабіць так, каб вярнуць любоў, узаемаразуменне, мір. І не трэба суседзям умешвацца ў нашу справу. Мы самі разбяромся. Мы розныя, у нас розныя меркаванні, але гэта наш дом, наша Беларусь, наш народ, — пераканана **старшыня Беларускага саюза жанчын Мар'яна ШЧОТКІНА.**

Жанчыны заўсёды супраць насілля, адзначыла яна. У сэрцах жанчын боль ад тых падзей, што адбыліся. Хто пераступіў закон, павінны быць прыцягнуты да адказнасці. А тых, хто мае намер яго парушыць, удзельніцы мітынгу заклікалі спыніцца.

— Напярэдсе першае верасня. Мы заўсёды казалі, што павінны павысіць прэстыж педагога. А цяпер на настаўнікаў, якія выхоўвалі нас, якім давяраем нашых дзяцей, аказваецца псіхалагічны ціск. Я як настаўнік звяртаюся да тых вучняў, якія прынеслі да школы свае дыпломы і граматы: «Яны не вашы, яны нашы!» Гэта настаўнікі не спалі, уклалі ў вас душу. Пройдзе час, і вам стане соромна. Але ведайце, што кожны настаўнік стане побач з вамі і скажа: «Я дарую табе, дзіця!» — эмацыянальна выказалася Мар'яна Шчоткіна.

З ёй пагадзіліся ўдзельнікі мітынгу і заклікалі бацькоў, грамадзян падтрымаць настаўнікаў.

Таццяна ГЕОРГІЕВА.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

У тэму

«ДАВАЙЦЕ ЗБЕРАЖЭМ СПАКОЙ!»

Хлебаробы Століншчыны першыя не толькі ў Брэсцкай вобласці, але і ў краіне, завяршылі жніво і ўжо ў мінулыя выхадныя адзначылі свята дажынак. Святкаваць было што. Кожны гектар збажыны даў амаль 40 цэнтнераў збожжа, а некаторыя гаспадаркі значна перавысілі ўказаны рубеж. Фестываль-кірмаш правялі ў вёсцы Лядзец у суботу. А ў чацвер многія з удзельнікаў кірмашу зноў сабраліся на мерапрыемства, гэтым разам у Століне. Тут прайшоў мітынг «За мірную Беларусь».

Ад аграрыяў слова ўзяў Мікалай Шаўчук, старшыня прафкама сельгаспрадпрыемства «Відзіборскі». Ён падкрэсліў неабходнасць спакою і стабільнасці для паспяховай работы эканомікі. Да міру, разважлівасці, спакою заклікала старшыня ветэранскай арганізацыі раёна Валянціна Мірановіч.

З асаблівай увагай слухалі ўдзельнікі мітынгу Святлану Нагар, загадчыцу дзіцячага садка вёскі Белавуша. Быць на гэтым мітынгу ў Святланы Фёдараўны асаблівая нагода, яна нарадзілася і вырасла, атрымала адукацыю ва Украіне, там цяпер жывуць яе блізкія сваякі.

— Цяперашнія падзеі ў нашай краіне болем адгукаюцца ў маім сэрцы, перажываю другі раз. Першы раз я пакутавала з роднай Украінай, калі адбываўся майдан і ўсе яго наступствы. Прайшлі гады, і што мы маем там: напрыклад, мая сястра з больш чым трыццацігадовым педагагічным стажам атрымлівае пенсію памерам у 50 доларaў, мама — яшчэ меншую. Людзям жывецца цяжка не толькі матэрыяльна, ніяк не наступае жаданы спакой.

Таму больш за ўсё трэба даражыць мірам, спакоем, ні ў якім разе не дапусціць вайны альбо хаосу! Я заклікаю ўсіх думаць, разважаць, адмовіцца на час ад эмоцый і пасяліць у сэрцах любоў. Трэба падумаць, чаго мы хочам у рэшце рэшт: спакойна працаваць, вадзіць дзяцей у школу і садок ці бясконца высвятляць адносіны і множыць напружанасць? Давайце зберажэм мілую Беларусь для дзяцей і ўнукаў, — папрасіла педагог.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Да Дня беларускага пісьменства

ПОМНІК-ВЫШЫНАНКА, СТАРАДАЎНЯЯ ФРЭСКА, МЕДЫЯЦЭНТР...

Намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый МАЛАШКА расказаў «Звяздзе» пра тое, што было зроблена да Дня беларускага пісьменства ў Бялынічах. Свята адбудзецца ўжо праз тыдзень — 6 верасня.

Прыгожы ландшафт, знаёмы нам па карцінах тутэйшага ўраджэнца, славутага мастака Вітольда Бялыніцкага-Бірулі, жылыя дамы жыццесцвярджальнага белажоўта-ружовага адцення, шыкоўны музей, які цалкам змяніў сваё аблічча, ліпавы гай, дзе цяпер ёсць усё для культурнага і аздараўленчага адпачынку гараджан. Бялынічы сёння наогул не пазнаць. За год падрыхтоўкі да свята тут шмат чаго кардынальна памянялася, з'явіліся новыя культурныя аб'екты, месцы для адпачынку, двары сталі больш утульныя, а будынкі — прыгожыя. Старшыня Нацыянальнага аргкамітэта Дня беларускага пісьменства, намеснік прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Ігар Петрышэнка ацаніў на нядаўнім пасяджэнні гэтыя змены на выдатна. Пра тое, як ішла падрыхтоўка да свята, чым яно парадуе сваіх гасцей і ўдзельнікаў, што зроблена для культурнага жыцця ў глыбінцы, якія існуюць асабістыя прыярытэты ў літаратуры — у размове з Валерыем Малашкам, намеснікам старшыні Магілёўскага аблвыканкама, а таксама старшынёй абласнога аргкамітэта па падрыхтоўцы Дня пісьменства ў Бялынічах.

— Што ўнікальнага зроблена? Шмат аб'ектаў, будынкаў, збудаванняў вельмі хутка набылі новае жыццё дзякуючы Дню беларускага пісьменства, — кажа Валерый Анатолевіч. — Гэта матэрыяльная і нематэрыяльная спадчына свята. На мой погляд, мы вельмі ўдала зрабілі з кінатэатра «Зорка», які быў да нядаўняга часу недазагружаны, медыяцэнтр для сямейнага адпачынку. Цяпер гэта дзве бібліятэкі — дарослая і дзіцячая, а таксама 3D-кіназала, якая можа выкарыстоўвацца для розных, у тым ліку сямейных мерапрыемстваў. На Дзень пісьменства ў гэтай кіназале будзе прадстаўлены монаспектакль Магілёўскага абласнога тэатра ляляк «Сіняя-сіняя» па аднайменным апавяданні Уладзіміра Караткевіча, 90-гадовы юбілей якога мы сёлета адзначаем. Тут жа адбудуцца паказы мастацкіх і мультыплікацыйных фільмаў па творах беларускіх класікаў або прысвечаных іх дзейнасці. У сценах медыяцэнтра будуць працаваць адначасова некалькі выставак, прысвечаных творчасці і жыццёваму шляху Янкі Купалы, Уладзіміра Караткевіча, Кузьмы Чорнага (сёлета мы адзначаем яго 130-гадовы юбілей) і іншых пісьменнікаў.

— Па легендзе ўсё пачалося менавіта з іконы Бялыніцкай Божай Маці, якую прывезлі на тутэйшую зямлю кіеўскія манахі. Ззянне ад яе было такое, што ноччу асвяціла мясцовасць як днём. Гэта і вызначыла назву будучага мястэчка. У Бялынічах з'явілася мноства звязаных з паходжаннем горада і яго шматгадовай гісторыяй сімвалаў. Якая работа зроблена для таго, каб гэта захаваць для нашчадкаў?

— Так. Анёл з іконай Бялыніцкай Божай Маці перад медыяцэнтрам — гэта наогул вельмі сімвалічны вобраз. Шмат было варыянтаў, як гэта павінна выглядаць, але ўсе яны паўтаралі сімвалы, якія ўжо ёсць, і вельмі літаральна трактавалі гісторыю з'яўлення абраза. У рэшце рэшт быў знойдзены найлепшы варыянт — вобраз анёла ў выглядзе беларускай выцінанкі з іконай Бялыніцкай Божай Маці. Анёл зроблены з шэрага ўкраінскага граніту (як вядома, манахі ратаваліся ад нашэсця Батыя і плылі сюды з Кіева), а абраз, які трымае анёл, з металу — усё гэта разам робіць кампазіцыю сімвалічнай і ўнікальнай.

Бялыніччане нарэшце ўбачаць і той цудам захаваны кавалачак іх гісторыі — фрэску XVII стагоддзя «Нясенне крыжа» са знішчанага ў савецкі час кармеліцкага манастыра. Увесь гэты час фрэска літаральна захоўвалася ў скрынях у разабраным выглядзе, і зараз мсціслаўскі майстар вярнуў яе да жыцця. Яна зманціравана ў асобнай зале «Духоўнасць». У гэтага біблейскага сюжэта вельмі вялікі сэнс — нясенне крыжа. Гэта датычыцца і ўсіх нас, ніхто іншы наш крыж не панясе, гэта павінны рабіць толькі мы самі.

Сам раённы мастацкі музей прыкметна павялічыўся ў памерах. Старшыня аблвыканкама Леанід Заяц падтрымаў ідэю яго перабудовы, хоць для гэтага спатрэбілася дадатковае фінансаванне.

— Прэзідэнт краіны неаднаразова звяртаў увагу на тое, што трэба ствараць умовы для жыцця ў маленькіх гарадах не горшыя, чым у Мінску. Мяркуючы па той рабоце, якая была зроблена ў Бялынічах, гэта як раз той выпадак.

— Увага да жыхароў маленькіх населеных пунктаў вельмі важная. Яшчэ Алена Аладава, работнік культуры і мастацтва з вялікай літары, дапамагла жонцы Вітольда Бялыніцкага-Бірулі прыняць важнае рашэнне — частку работ мастака пакінуць у Магілёве. Яны спецыяльна былі выдзелены для гэтага з фондаў Нацыянальнага мастацкага музея. Яшчэ вобласці была перададзена частка мастацкіх работ савецкага сацрэалізму. На адваротным баку карцін стаіць пометка, што гэта маёмасць Нацыянальнага мастацкага музея. Цяпер калекцыя размешчана ў Бялыніцкім мастацкім музеі ў асобнай зале. Вырашана таксама зрабіць бялыніцкі музей філіялам Магілёўскага абласнога мастацкага музея імя П. Масленікава і абагульніць іх фонды. Усё гэта робіцца наўмысна, каб выхоўваць у тутэйшых дзяцей любоў да прыгожага, да сваёй радзімы. Бялыніцкая зямля наогул вельмі шчодрая на таленавітых мастакоў. У музеі можна ўбачыць карціны ўраджэнцаў Бялыніччыны Віктара Альшэўскага і Ларысы Журавовіч.

Акрамя гэтага бялыніцкі музей пашырае свае магчымасці і будзе дэманстраваць цяпер яшчэ і так званыя краязнаўчыя экспанаты, якія адносяцца да археалогіі і гісторыі краю. Асобна трэба сказаць пра тэхнічныя магчымасці музея — ён аснашчаны сучаснымі сістэмамі вентыляцыі, сродкамі відэакамунікацыі, аховы — усім тым, што трэба для дэманстрацыі твораў мастацтва любога ўзроўню, нават з сусветна вядомых музеяў. Тут створаны ўсе ўмовы для бязбар'ернага асяроддзя.

У зале «Духоўнасць» будзе ўстаноўлены арган, каб праводзіць адпаведныя канцэрты і вечары. У планах — даць магчымасць вясковым дзецям навучыцца іграць на аргане. Музейная прастора стане месцам для адукацыі дзяцей, якія мараць прысвяціць сябе мастацтву.

— Раскажыце крыху пра святочную праграму, якія мерапрыемствы адбудуцца ў рамках Дня беларускага пісьменства. Хто тыя госці, якія завітаюць на гэтае культурнае мерапрыемства?

— Галоўныя ўдзельнікі свята — пісьменнікі, якія прыедуць у Бялынічы з розных абласцей. Запланаваны круглы стол з удзелам замежных літаратараў, фестываль кнігі і прэсы, навукова-практычная канферэнцыя «Бялыніцкія чытанні», шмат іншых не менш цікавых мерапрыемстваў, конкурсаў і фестываляў. На Ільінскай гары, адкуль у старажытнасці пачыналіся Бялынічы, адбудзецца асвячэнне капліцы.

Сцэнічныя і тэматычныя пляцоўкі працягнуцца ўздоўж усёй вуліцы Савецкай аж да самага парку «Ліпавы гай». Магілёўшчыну будзе прадстаўляць вялікая пляцоўка «Лёс зямлі маёй праз слова», дзе восем тэматычных «старонак» наглядна прадэманструюць наш гістарычны шлях ад радзімічаў да сённяшняга дня. Тут можна будзе пабачыць і берасцяную грамату, і Статут Вялікага Княства Літоўскага, і карціны прыдворнага мастака Мікалая II, іншыя рарытэты. На галоўнай сцэне свята адбудзецца музычальна-тэатралізаваная дзея «Старонцы роднай пакланюся» з узнагароджаннем пераможцаў рэспубліканскага конкурсу кніжных буктрэйлераў «Кніга з экрана».

Фота Галіны ХІТРЫКАВАЙ.

Удзельнікі аргкамітэту падчас падрыхтоўкі да Свята беларускага пісьменства.

Мы запрашаем на гала-канцэрт маладзёжна-патрыятычнай песні, тэматычныя мерапрыемствы для дзяцей і моладзі, якія цэлы дзень будуць праходзіць у парку і на стадыёне. Да паслуг гасцей і ўдзельнікаў — гандлёвыя рады і пункты грамадскага харчавання, выстаўкі і майстар-класы. Аматарам народнай творчасці раю наведаць шматпрофільную пляцоўку «Свята з Бялынам». Дзецям цікава будзе акунуцца ў казку на выстаўцы-кірмашы «Вянок беларускіх казак». Але гэта яшчэ не ўвесь пералік таго, што адбудзецца ў Бялынічах. Прасцей прыехаць на свята і пабачыць усё сваімі вачыма.

— Што асабіста для вас значыць Дзень беларускага пісьменства? Як паўплываў працэс падрыхтоўкі да такога маштабнага літаратурнага мерапрыемства асабіста на вас? Якім літаратурным творам наогул аддаяце перавагу?

— У працэсе падрыхтоўкі да Дня беларускага пісьменства адбылася трансфармацыя асабістай свядомасці і адносін да самога мерапрыемства. Хацелася б, каб тое, што зроблена, не растала нейкім там воблачкам пасля таго, як усё скончыцца, а пакінула пасля сябе нешта грунтоўнае. У Бялынічах не было ніводнай плошчы, а цяпер іх дзве. Адна побач з музеем — манастырская і асветніцкая — побач з аддзелам адукацыі. Плюс музей, медыяцэнтр і ўсё астатняе.

Што датычыцца асабістых адносін да літаратуры, магу сказаць без перабольшання — я ёй жыву. На жаль, усе менш часу для гэтага застаецца цяпер. Але я стараюся адсочваць навінкі, якія для мяне выбірае мая другая палова. Яна чытае нашмат больш і добра ведае мой густ. Дома ў нас вялікая бібліятэка, зараз яна папаўняецца яшчэ і кнігамі на электронных носьбітах. На дзень нараджэння дзеці падарылі мне электронную кнігу, дзе вельмі добрая падборка класікаў і сучасных пісьменнікаў. Апошнія некалькі гадоў я слухаю літаратуру нават у машыне. Ні адна далёкая паездка з сям'ёй не абыходзіцца ў нас без літаратурных твораў. Калі ездзілі ў Прыбалтыку, праслухалі ўжо крыху прызабыты раман Льва Талстога «Вайна і мір». Я чарговы раз захапіўся літаратурным талентам гэтага класіка. Атрымаў уражанні і ад нашумелага рамана Гузель Яхінай, тэлесерыял па творах якой нядаўна прайшоў. Гэта той час, частку якога захапілі і мы. А зараз, дарэчы, слухаю ў машыне раман Уладзіміра Караткевіча «Каласы пад сярпом тваім». Гэта ўсё тая класіка, якую хочацца перачытваць не адзін раз.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

«БЕЛАЕ ЗОЛАТА» КАМУНАРАЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Цяпер малако па вёсках сельсавета збіраюць індывідуальныя прадпрымальнікі. У іх заключаны дагаворы на пастаўку прадукцыі з Любанскім сыраробным заводам. Малакавозы абсталяваныя прыборамі для вымярэння тлустасці. Калі раней нехта з жыхароў мог разбавіць малако вадой, то цяпер усё змянілася. Кожны разумее: няхай будзе менш малака, але яны выйграюць за кошт тлустасці. За літр здадзенага «белага золата» людзі атрымліваюць 55 капеек, разлік ідзе кожныя дзесяць дзён.

Няма праблемы і з тым, каб здаць цялят. Іх закупляюць у грамадзян адкрытыя акцыянерныя таварыствы «Палессе-Агра» і «БВА», што знаходзяцца на тэрыторыі сельсавета. За кілаграм жывой вагі яны даюць 15 кілаграмаў зерня і сена.

— Людзі трымаюцца за асабістую дапаможную гаспадарку, паколькі яна прыносіць дадатковы прыбытак у сямейны бюджэт. Яны думаюць аб далейшым жыцці, будуюць планы на будучыню. Нехта мяркуе набыць сельскагаспадарчы інвентар, пашырыць сваю гаспадарку, хтосьці — нешта купіць, пабудаваць. Гэта таксама добрая нагода дапамагчы дзецям стаць на ногі. Акрамя таго, на стале заўсёды натуральныя свойскія прадукты: малако, тварог, смятана, яйкі, мяса, сала. Разам з тым тыя, хто трымае сваю гаспадарку, паралельна занятыя ў сельгасарганізацыях, пітомніку лясгаса.

Святлана Носікава з вёскі Нежын была на розных пасадах — загадчыцай фермы, асемянатарам, лабарантам у ААТ «БВА». Толькі сёлета ў сакавіку сышла з работы па стане здароўя. Яе муж працягвае працаваць асемянатарам і ветфельчарам.

Сям'я трымае 14 галоў буйной рагатай жывёлы разам з цялятамі, 16 коз, індыкоў, качак, парсюкоў, каня. Былі яшчэ і трусы, але нядаўна іх звялі.

— Штодзень надойваем па 130—140 літраў малака, здаём прыёмшчыку. Сабе пакідаем толькі казінае малако. Ад дзевяці дойных козачак добрыя надоі. Гэтае малако падыходзіць дзецям, людзям, у якіх алергія на каровіна малако, якія не пераносяць лактозу, — кажа Святлана Аркадзеўна.

Мы гутарым на ўтульным падворку каля вялікага цаглянага дома. Вакол парадак, чысціня, шмат зеляніны і кветак.

Святлана НОСІКАВА з дачкой Лізай.

— Як паспяваеце з усім спраўляцца? — пацікавілася ў гаспадыні.

— Устаём у пяць гадзін раніцы, надзяваем гумавыя боты і круцімся ўвесь дзень, як вавёрка ў коле: кормім жывёлу, доім, выганяем на пашу, затым сустракаем з поля, зноў доім. А яшчэ трэба і стойлы пачысціць, і сена нарыхтаваць на зіму.

Каля вялікага хлява заўважаю будаўнічыя матэрыялы.

— Збіраемся пабудаваць новае памяшканне для жывёлы, — перахапіла мой погляд Святлана. — Старое стала цеснаватае, бо колькасць пагалоўя з кожным годам павялічваецца. Вядзём свой адбор маладняку. Найлепшых прадукцыйных цялушак пакідаем сабе. Астатніх пастаўляем у калгас. Летась за здадзены маладняк атрымалі тры тоны зерня. Мелем зерне сваім млынам, муку дадаём у корм хатняй птушцы, свінням.

— Цяпер практычна кожны жыхар, які трымае жывёлу, мае свой млын. Можна размалоць і ў калгасе, але за пэўную плату, — удакладняе старшыня сельвыканкама. — Акрамя таго, людзі маюць коней, трактары, сельгасінвентар, што значна спрашчае работу.

Праўда, ёсць некаторыя праблемы з выпасам жывёлы. Паша, якая існуе 25 гадоў, не акультураная. Нарыхтоўваюць сена на няўдобіцах, лясных палянах. Калі раней можна было прывязаць кароў на вясковых пустырах, пустуючых участках, то цяпер яны засеяны і ўведзены ў сельгасабарот.

Сёлета кіраўніцтва «БВА» пайшло насустрач просьбам уласнікаў выдзеліць і залужыць 35 гектараў зямлі пад пашу. Калгас палічыў усе магчымыя выдаткі. За кожную карову неабходна было ўнесці 70 рублёў. Але большасць гаспадароў не пагадзілася з такім варыянтам.

— Хочаш добра жыць — працуй, не лянуйся і спадзявайся на свае сілы, — кажа Святлана Носікава. — Будзе і скварка, і да скваркі. І дзецям будзе што ў сумку пакласці.

— А на продаж нешта застаецца, напрыклад, сыр, масла, тварог?

— Па-першае, гэтыя прадукты мы робім для сваіх патрэб, часцей за ўсё позняй восенню ды зімой, калі больш вольнага часу. А прадаць яго не можам — да горада далёка, да вялікіх магістраляў, каб можна было прапанаваць прадукцыю праезным, — кажа Святлана Носікава.

Падчас нашай гутаркі на ганак выходзіць дзяўчынка і цікаўна паглядае на гасцей.

— Гэта мая малодшая дачушка, мая памочніца, — усміхаецца маці.

Ліза перайшла ў чацвёрты клас, добра вучыцца.

— Я дапамагаю маме даіць козачку, даглядаю коцікаў і сабак, — сарамліва кажа дзяўчынка.

Не толькі ў гэтай сям'і растуць памочнікі. Дзіму Хамлюка мы таксама засталі за справай. Хлопчык ачышчаў ад бруду бацькоўскі трактар. «Сёння прыйдзе брат мамы дзядзька Коля, каб памяняць некаторыя дэталі», — кажа школьнік. — А маме тэрмінова давялося выехаць у райцэнтр. Яна папярэдзіла, што вы будзеце».

Дзіма сёлета пойдзе ў сёмы клас.

— Бацькі трымаюць 9 дойных кароў і цялят. Мой абавязак — паіць малых, прыганяць з пашы рагуль і карміць трох парсюкоў па даручэнні бацькі. Колькі ў нас свіней, я не лічыў, але многа, — дадаў Дзіма.

Прыемна, што ў сем'ях растуць руплівыя, працавітыя дзеці, якія бяруць прыклад з бацькоў. Зносіны з жывым, з прыродай выхоўваюць у іх пачуццё дабрыні, спачування і да людзей.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ, фота аўтара.

АПК

Будзе хлеб і да хлеба

Для работнікаў аграрнага сектара сённяшні сезон аказаўся дастаткова складаны. Анамальна цёплая зіма і ранняя вясна першапачаткова зрушвалі запланаваныя тэрміны сяўбы. Праўда, потым халодны май амаль не разбурыў станоўчыя планы аграрыяў. І ўсё ж дзякуючы напружанай працы нашых вяскоўцаў у краіне сёння згатаваны дастаткова важкі каравай.

Намеснік начальніка Галоўнага ўпраўлення — начальнік упраўлення раслінаводства Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Васіль ЯДЛОЎСКІ адзначыў, што сёння ў Беларусі разлічваюць атрымаць валавы збор збожжа не менш за 7 млн тон у свірнавай вазе. А з улікам кукурузы на зерне атрымаецца сабраць усе 8 млн тон.

Калі казаць аб харчовым збожжы, якое выкарыстоўваецца насельніцтвам у якасці хлебабулачных, крупяных або макаронных вырабаў, то для гэткага элітнага каравая ў нас намалочана 800 тысяч тон. Такога хлеба аграрыі запасаюць штогод з лішкам, таму можна з упэўненасцю казаць пра «сытую зіму».

Значная частка ўсяго збожжа ідзе на фуражныя мэты: дзесьці 5-6 млн тон штогод мы выкарыстоўваем на корм жывёле. Калі атрымліваецца лепей накарміць статак, то і аддача — у выглядзе малака і мяса — будзе значна больш важкая. А ў выніку атрымліваецца, што мы пастаўляем на экспарт не проста фуражнае збожжа, а гатовыя прадукты з высокай дабаўленай вартасцю.

Па словах Васіля Ядлоўскага, сярэдняя ўраджайнасць намалочанага збожжа ў бункернай вазе складае 37,3 цэнтнера з гектара. Лепш за ўсё з гэтым паказчыкам у Гродзенскай вобласці, дзе атрымалі 47,8 цэнтнера з гектара. Самая нізкая ўраджайнасць збожжа ў Гомельскай вобласці (27 цэнтнераў), але там упор робіцца на кукурузу на зерне. У гэтым рэгіёне традыцыйна вялікія пасевы згаданай культуры, таму выніковая лічба ўраджайнасці яшчэ будзе змяняцца ў бок павелічэння.

Суразмоўнік упэўнены ў тым, што прадукты харчавання ў гэтым сезоне ў нас даражэць не павінны. Сёлета іх у краіне будзе з лішкам. Прынамсі, фуражнага збожжа мы збяром значна больш, чым у мінулыя гады.

Сяргей КУРКАЧ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Прэм'ер Японіі абвясціў аб адстаўцы з-за стану здароўя

«Я прыняў рашэнне сысці з пасады прэм'ер-міністра. Я хацеў бы папрасіць прабачэння перад народам Японіі», — сказаў Сіндзо Абэ на прэс-канферэнцыі. Ён растлумачыў, што здароўе пачало пагаршацца з сярэдзіны ліпеня і цяпер ён мае патрэбу ў курсе лячэння. Прэм'ер адзначыў, што на рашэнне сысці ў адстаўку, якое ён прыняў самастойна, паўплывала паляпшэнне сітуацыі з каранавірусам у Японіі. Ён таксама сказаў, што працягне выконваць абавязкі прэм'ера, пакуль яму не абяруць пераемніка. Пры гэтым прэм'ер адмовіўся выказваць здагадкі, хто б мог ім стаць. Абэ займае гэтую пасаду самы доўгі час у найноўшай гісторыі краіны — на працягу ўжо амаль васьмі гадоў, са снежня 2012-га. Акрамя таго, ён узначальваў урад у 2006—2007 гадах.

Прэзідэнт Паўднёвай Карэі параўнаў страйк урачоў з дэзерцірствам на поле бою

«Адмова медыкаў працаваць у сітуацыі найбуйнейшай пандэміі раўназначна ўцёкам салдат падчас бітвы», — падкрэсліў Мун Чжэ Ін. Прэзідэнт выказаў надзею на найхутчэйшае вяртанне ўрачоў да работы, адначасова пацвердзіўшы намер у рамках закона жорстка адрэагаваць на дзеянні медыцынскіх колаў. Урад вынес пастанову, у адпаведнасці з якой медыкі, якія працуюць у клінічных бальніцах, павінны вярнуцца да выканання сваіх абавязкаў. Сітуацыя ўжо прывяла да скарачэння колькасці хірургічных аперацый, быў зарэгістраваны першы выпадак смерці з прычыны таго, што пацыент з-за забастоўкі ўрачоў не змог атрымаць медыцынскую дапамогу. Паўднёвакарэйскія медыкі выступаюць супраць рэформы аховы здароўя, прапанаванай урадам. Яна прадугледжвае павышэнне квоты на прыём у медыцынскія навучальныя ўстановы. Забастоўшчыкі асцерагаюцца, што павелічэнне колькасці ўрачоў прывядзе да ўзмацнення канкурэнцыі і зніжэння іх даходаў.

Трамп афіцыйна стаў кандыдатам у прэзідэнты ЗША ад рэспубліканцаў

Дзеючы прэзідэнт ЗША Дональд Трамп даў згоду балатавацца на другі тэрмін на пасаду кіраўніка дзяржавы ад Рэспубліканскай партыі. «Я ганаруся вашым даверам і тым, што вы вылучылі мяне на пасаду прэзідэнта на наступныя чатыры гады», — сказаў Трамп у завяршальны дзень работы з'езда рэспубліканцаў. Ён абавязаўся «абараняць Амерыку ад усякай небяспекі» і весці яе па шляху далейшага развіцця і росквіту, а таксама працягваць «барацьбу з фашызмам і камунізмам». Майк Пенс афіцыйна стаў кандыдатам на пасаду віцэ-прэзідэнта ЗША. Супрацьстаяць ім будуць кандыдат у прэзідэнты ад Дэмакратычнай партыі Джо Байдэн і кандыдат у віцэ-прэзідэнты Камала Харыс.

Аты-баты

ВУЧЭННІ НА ГРОДЗЕНСКІМ НАПРАМКУ

З 28 да 31 жніўня на гродзенскім напрамку праходзіць тактычнае комплекснае вучэнне. Падчас яго перамяшчаецца даволі вялікая колькасць ваеннай тэхнікі. Яна паедзе па дарогах агульнага прызначэння Гродзенскага раёна, што можа часова ўскладніць па іх рух.

Так, у суботу будуць часова перакрыты дарожныя напрамкі Фолюш — Падлабенне — Пушкары — Зарачанка — Каўбаскі — Белыя Балоты. У нядзелю — Дайлідкі — Жукевічы, Бросты — Саломенка, Дайлідкі — Квасоўка, Каменка — Каўпакі, Сухмені — Зарубічы.

— Заклікаем жыхароў населеных пунктаў і кіроўцаў транспартных сродкаў быць як мага больш уважлівымі, а таксама браць пад увагу ўмовы надвор'я, — адзначылі ў Міністэрстве абароны.

Тым часам у беларускай арміі працягваюцца плануемыя мерапрыемствы баявой падрыхтоўкі на палігонах і асобных участках мясцовасці. У склад групоўкі, задзейнічанай на вучэннях, уключаны механізаваныя, танкавыя, парашутна-дэсантныя, артылерыйскія, інжынерныя падраздзяленні. Таксама ўдзельнічаюць разлікі беспілотных авіяцыйных комплексаў і радыёэлектроннай барацьбы.

— Задачы па прызначэнні выконваюць разведвальныя падраздзяленні 11-й асобнай механізаванай брыгады, — праінфармавалі ў прэс-службе ваеннага ведамства. — Падраздзяленні 465-й ракетнай брыгады і 336-й рэактыўнай артылерыйскай брыгады вядуць заняткі па прадметах баявой падрыхтоўкі і нясуць баявое дзяжурства. Кантрольныя заняткі па агнявой падрыхтоўцы ў гэтыя дні праходзяць на Абуз-Лясноўскім палігоне з мотастралковымі і танкавымі падраздзяленнямі 6-й асобнай механізаванай брыгады. Мотастралковы батальён са сродкамі ўзмацнення 19-й асобнай механізаванай брыгады задзейнічаны на батальённых тактычных вучэннях на Барысаўскім палігоне. Яны адбываюцца з баявой стральбой. Кантрольныя заняткі па спецыяльнай падрыхтоўцы адбываюцца на палігоне Даманава з зенітнымі ракетнымі артылерыйскімі дывізіёнамі 6-й і 11-й асобных механізаваных брыгад.

Дзяржаўную граніцу ў паветранай прасторы ахоўваюць лётчыкі на самалётах Як-130 116-й штурмавой авіяцыйнай базы.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

ОФИЦИАЛЬНЫЕ ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

«ПОКУПКИ В ВЫГОДНОМ СВЕТЕ. ПРОДОЛЖЕНИЕ»

Настоящие правила проведения рекламной игры «Покупки в выгодном свете. Продолжение» (далее – Правила), направленной на стимулирования проведения безналичных платежей держателями платежных карт Mastercard, эмитированных Открытым акционерным обществом «Сберегательный банк «Беларусбанк» (далее – Карта), разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 № 51 (с изменениями и дополнениями), и определяют порядок проведения рекламной игры «Покупки в выгодном свете. Продолжение» (далее – Рекламная игра).

1. **Организатор**

Организатором Рекламной игры является Общество с ограниченной ответственностью «Пиар квадрат», УНП 191682518. Адрес Организатора: Республика Беларусь, 220030, г. Минск, ул. Ленина, д. 50, 5-й этаж, оф. пом. 5 (далее – Организатор).

2. **Участники Рекламной игры**

К участию в Рекламной игре приглашаются все граждане Республики Беларусь, достигшие 18 лет и являющиеся владельцами дебетовых карточек Mastercard, эмитированных Открытым акционерным обществом «Сберегательный банк «Беларусбанк» (далее – Карта).

Участником Рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

3. **Определения**

3.1. личная дебетовая карточка – дебетовая карточка, использование которой предусмотрено договором об использовании карточки, заключенным между банком-эмитентом и физическим лицом;

3.2. счет Участника Рекламной игры – банковский счет, доступ к которому обеспечен при использовании дебетовой карточки.

4. **Название Рекламной игры:** «Покупки в выгодном свете. Продолжение»

5. **Территория проведения Рекламной игры:** Республика Беларусь.

6. **Дата начала Рекламной игры:** 1 сентября 2020 г.

7. **Дата окончания Рекламной игры:** 25 декабря 2020 г.

8. **Наименование товаров, в целях стимулирования реализации которых проводится Рекламная игра:** Рекламная игра проводится в целях стимулирования проведения безналичных платежей держателями дебетовых карточек Mastercard, эмитированных Открытым акционерным обществом «Сберегательный банк «Беларусбанк» (далее – безналичная операция).

9. **Призовой фонд Рекламной игры**

Призовой фонд Рекламной игры формируется за счет денежных средств и имущества Организатора в размере 161136,90 рублей (Сто шестьдесят одна тысяча сто тридцать шесть белорусских рублей 90 копеек).

Призовой фонд Рекламной игры включает следующие призы:

№	Полное наименование состава призового фонда	Короткое наименование призового фонда	Кол-во	Оценка приза в баллах	Стоимость за ед., бел. руб.	ИТОГО стоимость, бел. руб.
1	Диван Ikea «Ландскруна» 893.198.77	Диван Ikea «Ландскруна»	3	650	2343,96	7031,88
	Денежное вознаграждение				350,24	1050,72
2	Ноутбук Asus VivoBook X512FL-BQ287	Ноутбук Asus VivoBook	9	550	1680,00	15120,00
	Денежное вознаграждение				251,03	2259,27
3	Телевизор Samsung UE43RU7410U	Телевизор Samsung	9	500	1398,96	12590,64
	Денежное вознаграждение				209,04	1881,36
4	Холодильник с морозильником Liebherr CNkw 4313	Холодильник с морозильником Liebherr	3	500	1365,00	4095,00
	Денежное вознаграждение				203,96	611,88
5	Портативная колонка JBL Charge 4 (зеленый)	Портативная колонка JBL Charge 4	15	200	358,98	5384,70
	Денежное вознаграждение				53,64	804,60
6	Готовая кухня Ikea «Кнюксульт» 491.841.73	Готовая кухня Ikea «Кнюксульт»	1	500	1611,19	1611,19
	Денежное вознаграждение				240,75	240,75
7	Кресло мягкое Ikea «Ландскруна» 592.697.27	Кресло мягкое Ikea «Ландскруна»	3	350	1271,04	3813,12
	Денежное вознаграждение				189,92	569,76
8	Горка Ikea «Бесто» 592.505.58	Горка Ikea Бесто	2	250	892,27	1784,54
	Денежное вознаграждение				133,32	266,64
9	Электрогриль Tefal GC306012	Электрогриль Tefal GC306012	25	250	298,98	7474,50
	Денежное вознаграждение				44,67	1116,75
10	Смартфон Xiaomi Redmi Note 8 Pro 6Gb/64Gb Forest Green	Смартфон Xiaomi Redmi Note 8 Pro 6Gb/64Gb	25	350	639,00	15975,00
	Денежное вознаграждение				95,48	2387,00
11	Робот-пылесос Xiaomi Mi Robot Vacuum Cleaner SKV4022GL/SDJQR02RR	Робот-пылесос Xiaomi Mi Robot Vacuum Cleaner	20	330	658,98	13179,60
	Денежное вознаграждение				98,46	1969,20
12	Мультиварка Redmond SkyCooker RMC-M92S	Мультиварка Redmond SkyCooker RMC-M92S	15	200	294,90	4423,50
	Денежное вознаграждение				44,06	660,90
13	Кофеварка эспрессо Vitek VT-1522 BK	Кофеварка-эспрессо Vitek VT-1522 BK	30	250	369,00	11070,00
	Денежное вознаграждение				55,13	1653,90
14	Умные часы Amazfit GTS / A1914 (obsidian black)	Умные часы Amazfit GTS / A1914	15	200	334,98	5024,70
	Денежное вознаграждение				50,05	750,75
15	Аккумуляторная дрель-шуруповерт Bosch EasyDrill 1200 (0.603.9A2.10B)	Аккумуляторная дрель-шуруповерт Bosch EasyDrill 1200	30	150	195,00	5850,00
	Денежное вознаграждение				29,13	873,90
16	Отпариватель Polaris PGS 1518CA SteamProfi (мятный / белый)	Отпариватель Polaris PGS 1518CA SteamProfi	30	150	99,00	2970,00
17	Электрочайник Kitfort KT-624	Электрочайник Kitfort KT-624	25	140	75,00	1875,00
18	Торшер Ikea «Нут» 103.604.88	Торшер Ikea «Нут»	10	140	74,64	746,40
19	Блендер погружной Vitesse VS-229	Блендер погружной Vitesse VS-229	25	120	94,44	2361,00
20	Ультразвуковой увлажнитель воздуха Ballu UHB-200 (черный / зеленый)	Ультразвуковой увлажнитель воздуха Ballu UHB-200	25	110	79,98	1 999,50
21	Утюг Tefal FV1550E0	Утюг Tefal FV1550E0	25	120	99,96	2 499,00
22	Микроволновая печь Samsung GE88SUW/BW	Микроволновая печь Samsung GE88SUW/BW	25	280	283,98	7 099,50
	Денежное вознаграждение				42,43	1060,75
23	Подарочный сертификат 21vek + на 75 рублей. Срок действия: до 10.04.2021	Сертификат на 75 рублей	120	160	75,00	9000,00
		ИТОГО:	490			**161 136,90**

10. Порядок участия в Рекламной игре:

Для участия в Рекламной игре необходимо в период с 01.09.2020 по 31.10.2020:

10.1. Пройти регистрацию на сайте belarusbank.21vek.by (далее – сайт) и получить доступ в личный кабинет. Зарегистрировать личный кабинет может только владелец личной дебетовой карточки.

10.1.1. Для прохождения регистрации Участник должен на сайте ввести в соответствующие поля:

• номер телефона Участника в международном формате;

• фамилию, имя и отчество (при наличии) Участника на русском языке (согласно документу, удостоверяющему личность).

После заполнения указанных полей Участник получает посредством SMS-сообщения код для входа в личный кабинет на сайте. Код для входа в личный кабинет, сообщаемый посредством SMS-сообщения, Участнику необходимо сохранить до окончания Рекламной игры.

10.1.2. В случае если информация об Участнике полностью соответствует информации в базе данных банка, Участник автоматически получит уведомление об успешном прохождении регистрации в личном кабинете на сайте не позднее 5 рабочих дней после создания личного кабинета.

В случае если информация об Участнике не соответствует данным банка, Участник также получит соответствующее уведомление в личном кабинете на сайте не позднее 7 рабочих дней после создания личного кабинета. В таком случае Участнику необходимо обратиться в учреждение банка, где была оформлена банковская платежная карточка, для обновления данных и последующей возможности регистрации. Срок обновления данных банком – до 5 рабочих дней, следующих за днем обращения.

После получения Участником уведомления об успешном прохождении регистрации на сайте Участнику доступен личный кабинет на сайте, где отображаются накопленные баллы и Призы Призового фонда Рекламной игры, доступные для участия в розыгрышах.

Начисление баллов Участникам Рекламной игры, успешно прошедшим процедуру регистрации, производится с момента начала Рекламной игры.

10.1.3. В случае попытки регистрации Участником одного и того же номера телефона дважды или более раз повторные данные не будут приниматься к участию в Рекламной игре.

10.2. Осуществить в период с 01.09.2020 по 31.10.2020 безналичную операцию в белорусских рублях на сумму не менее 10 бел. руб. по оплате товаров, работ (услуг) в организациях торговли (сервиса) с использованием дебетовой банковской платежной карточки, эмитированной ОАО «АСБ Беларусбанк» в любой валюте счета, и сохранить чек или карт-чек о совершенной операции.

Не является основанием для участия в Рекламной игре осуществление следующих операций:

- безналичные операции, совершенные до 01.09.2020 и после 31.10.2020;

- безналичные операции по снятию наличных денежных средств или пополнению счета;

- безналичные операции по переводу денежных средств с одной банковской платежной карточки на другую банковскую платежную карточку;

- безналичные операции, совершенные посредством банкоматов, инфокиосков, платежных терминалов самообслуживания, М-банкинга, интернет-банкинга, в кассах отделений банка, учреждениях РУП «Белпочта» и в системе ЕРИП;

- безналичные операции, связанные с оплатой телекоммуникационных услуг и приобретением телекоммуникационного оборудования, включая продажу телефонов в салонах связи (Унитарное предприятие по оказанию услуг «А1», СООО «Мобильные ТелеСистемы», ЗАО «Бест»);

- любые платежи в пользу страховых компаний, финансовых и брокерских услуг, а также операции по оплате услуг посредством интернет-ресурса e-pay.by, paypal, liqpay, yandex.money, сервиса ООО ВЭБ ПЭЙ»;

- безналичные операции по оплате услуг по осуществлению пассажирских перевозок (включая железнодорожные перевозки, автобусные линии, авиалинии);

- безналичные операции, связанные с прямым маркетингом (в том числе продажей из каталогам, почте, телефону, подписке);

- безналичные операции, связанные с азартными играми (включая операции в казино и иных игорных заведениях, оплата ставок и пари, в том числе через интернет);

- безналичные операции, по которым в течение периода участия в Рекламной игре совершены возвраты;

- четвертая и последующие безналичные операции, совершенные участником Рекламной игры в одном и том же терминальном устройстве организации торговли (сервиса) в течение одних суток.

10.3. Накопить необходимое количество баллов для возможности участия в розыгрыше конкретного Приза (согласно п. 9 Правил). Баллы Участника конвертируются из суммы безналичных операций, совершенных в период с 01.09.2020 (00 часов 00 минут) до 31.10.2020 (23 часов 59 минут).

10.3.1. Статус накопления баллов доступен к отслеживанию в личном кабинете на сайте. При осуществлении возврата товаров, работ (услуг) начисление баллов на эту сумму не производится (начисленные ранее баллы аннулируются).

10.3.2. Баллы Участникам Рекламной игры по каждой конкретной безналичной операции начисляются в период времени от 00 часов 01 минуты по 08 часов 59 минут на 8-е сутки после совершения такой безналичной операции. Баллы всем Участникам Рекламной игры зачисляются одновременно и в период, недоступный для выбора призов, указанный в п. 10.4.1.

10.3.3. Механика конвертирования суммы безналичной операции в баллы: к участию в Рекламной игре принимаются безналичные операции в белорусских рублях на сумму не менее 10,00 бел. руб. При этом максимальная сумма безналичных транзакций одного Участника, которая может быть конвертирована в баллы, не может превышать сумму эквивалентную 500,00 бел. руб. в сутки и 6 500,00 бел. руб. за всю Рекламную игру.

Баллы для участия в Рекламной игре начисляются пропорционально сумме совершенной Участником безналичной операции: 0,01 бел. руб. = 0,001 балл. Начисленные баллы округляются до трех знаков после запятой. Так, например, за безналичную операцию в 10,00 руб. Участник получит 1,00 балл, за безналичную операцию в 11,12 руб. – 1,112 балла, за безналичную операцию в 193,56 руб. – 19,356 балла.

10.4. Первым выбрать любой Приз в личном кабинете на сайте (ссылка «ПРИЗЫ») из перечня Призов (п. 9 Правил) при условии накопления необходимого для участия в розыгрыше Приза количества баллов (далее – выбрать Приз) и заполнить форму на сайте, ввести на сайте в личном кабинете адрес электронной почты для возможности уведомления Победителя и подтвердить адрес электронной почты, перейдя по ссылке из сообщения, отправленного на нее.

10.4.1. Призы к выбору в личном кабинете недоступны ежедневно с 21 часа 00 минут до 08 часов 59 минут, а также от 0 до 5 минут каждого часа во время проведения розыгрышей (в соответствии с п. 14) для актуализации количества призов, доступных для участия в розыгрыше.

10.4.2. Призы к выбору в личном кабинете доступны до 20 часов 59 мин 11.11.2020 года за исключением периода, указанного в п. 10.4.1 Правил.

11. Уведомление об успешном выборе Приза Участник получает в диалоговом окне на странице сайта с присвоением Порядкового номера Участника (вида 1000000, 1000001, 1000002 и т. д.), который присваивается согласно времени и дате выполнения Участником п. 10.4 Правил.

12. В Рекламной игре можно принимать участие неограниченное количество раз при выполнении условий Рекламной игры, предусмотренных настоящими Правилами.

13. Организатор не несет ответственности за достоверность сведений, указанных Участниками при регистрации на сайте.

14. **Место, даты, время и порядок проведения розыгрышей призового фонда, порядок определения Победителей Рекламной игры**

Розыгрыши Призов проводятся с 11.09.2020 по 11.11.2020 каждый час с 10 часов 00 минут до 21 часа 00 минут (далее – розыгрыш) по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Ленина, дом 50, 5-й этаж, офис 5.

14.1. Члены комиссии определяют Победителей розыгрыша каждого Приза путем определения из сформированного при проведении розыгрыша списка первых (по времени и дате выбора Приза), выполнивших условия п. 10 Правил, а именно:

• в розыгрыше в 10 часов 00 минут 11.09.2020 участвуют Участники, кто первыми (по времени и дате выбора Приза) выполнил Условия п. 10 Правил с начала Рекламной игры (00 часов 00 минут 01.09.2020) до 08 часов 59 мин 11.09.2020 (за исключением п. 10.4.1 Правил);

• В каждом следующем розыгрыше принимают участие Участники, которые первым (по времени и дате выбора Приза) выполнили Условия п. 10 Правил с начала Рекламной игры (00 часов 00 минут 01.09.2020) до 59 мин часа, предшествующего розыгрышу, за исключением Участников, признанных Победителями в предыдущих розыгрышах.

Участник, который первым (согласно времени и дате выбора Приза) выполнил условия участия в Рекламной игре (п. 10 Правил), признается Победителем (за исключением Участников, которые признаны Победителями в предыдущих розыгрышах Рекламной игры).

14.2. Розыгрыш Призов проводится по порядку и в количестве, описанном в п. 9 настоящих Правил. Неразыгранные Призы розыгрыша переходят в следующий розыгрыш до момента, пока все количество каждого вида Призов не будет разыграно.

14.3. По результатам каждого розыгрыша на сайте будет доступна актуальная информация о количестве Призов, в розыгрыше которых Участники могут принять участие в следующих розыгрышах.

14.4. Ответственность Организатора по выдаче Призов ограничена исключительно вышеуказанным количеством и видами этих Призов.

14.5. В случае если Победители конкретного Приза в обозначенном в п. 9 Правил количестве будут определены ранее, чем до 20 часов 59 минут 11.11.2020, дальнейшие розыгрыши этого Приза не проводятся.

14.6. В случае если призовой фонд Рекламной игры к моменту ее окончания будет разыгран не полностью, то неразыгранные Призы остаются в распоряжении Организатора.

15. В течение 22 календарных дней, следующих за датой признания Участника Победителем Рекламной игры, Организатором будет проведена проверка безналичных операций Победителя на достоверность и предмет отсутствия возвратов товаров, работ (услуг) в организации торговли (сервиса) (далее – проверка).

15.1. Организатор оставляет за собой право проверки данных на достоверность совершенных операций Победителями Игры, в том числе:

• обратиться в банки-эквайеры, организации торговли (сервиса), где была произведена операция для дополнительной проверки;

• запросить у Участника чек или карт-чек, подтверждающий факт оплаты товаров, работ (услуг), который Участник должен представить Организатору не позднее 3 рабочих дней с момента получения запроса посредством электронной почты. Копии данных документов Организатор оставляет себе.

15.2. В случае выявления Организатором возвратов товаров, работ (услуг) в течение 22-дневного периода, следующего за датой признания Участника Победителем, нарушения Участником Правил Рекламной игры, а также выявления случаев нарушения Правил Рекламной игры (в том числе совершение Участником четвертой и последующих безналичных операций в одном и том же терминальном устройстве организации торговли (сервиса) в течение одних суток) с целью умышленного увеличения количества начисленных баллов Организатор вправе аннулировать все накопленные Участником баллы, аннулировать решение о признании такого Участника Победителем Рекламной игры и отказать в выдаче Призов.

Организатор вправе также аннулировать решение о признании такого Участника Победителем Рекламной игры в случае, если Победитель не предоставляет необходимые подтверждающие документы, указанные в п. 15.1. настоящих правил.

В случае выявления возвратов товаров, работ (услуг), нарушения правил и непрохождения проверки на достоверность операций Победитель получает об этом уведомление SMS-сообщением, отправленным на номер телефона, указанный при регистрации, и уведомлением в личном кабинете на сайте не позднее 27 дней, следующих за днем проведения розыгрыша.

16. **Порядок уведомления победителей о результатах розыгрыша, порядок получения выигрыша.**

16.1. В случае успешного прохождения проверки Победители Рекламной игры извещаются о выигрыше посредством отправки сообщения на адрес электронной почты, указанной в личном кабинете на сайте, уведомлением в личном кабинете на сайте Рекламной игры не позднее 27 дней, следующих за днем проведения розыгрыша.

Организатор также оставляет за собой право дополнительно уведомлять Победителей звонком по телефону, указанному при регистрации на сайте и SMS-сообщением.

16.2. Организатор за счет собственных средств до 25 декабря 2020 г. обеспечивает доставку Призов (за исключением сертификатов) Победителям посредством курьерской службы 21vek.by по адресам фактического проживания или нахождения Победителей. Форма заполнения (для указания адреса доставки) для доставки Приза будет доступна Участнику в личном кабинете на сайте после определения Приза Участником.

Призы Сертификаты Победителям будут переданы (вручены) до 25 декабря 2020 г. на адрес электронной почты и размещены в личном кабинете на сайте и считаются переданными с момента отправки их на адрес электронной почты Победителя и с момента его размещения в личном кабинете на сайте Рекламной игры. Форма заполнения (для ввода электронной почты) будет доступна Участнику в личном кабинете на сайте после определения Приза Участником.

16.3. Призы (за исключением сертификатов) выдаются Победителям при наличии документа, удостоверяющего личность, и после оформления документов, связанных с выдачей Приза, и считаются переданными Победителю с момента подписания Победителем акта приема-передачи Приза и других необходимых для их получения документов, предоставляемых Организатором через службу доставки 21vek.by.

16.4. Победитель обязан выполнить все условия, предусмотренные Правилами, а также формальности, необходимые для получения Призов.

16.5. В случае если Победитель не может получить Приз лично, Приз (за исключением сертификата) может получить его доверенное лицо по предъявлении документа, удостоверяющего личность, и нотариально заверенной доверенности.

16.6. Призы не подлежат замене. Выплата денежного эквивалента Призов не осуществляется. Ответственность Организатора по выдаче Призов ограничена исключительно вышеуказанным количеством Призов.

16.7. В случае если Призы не выданы в установленные Правилами Рекламной игры сроки согласно п. 16.2 и/или с Победителями не удается связаться и уведомить о выигрыше из-за некорректных данных, либо достоверность данных об совершенных операциях не подтверждается, или Организатором выявлен факт возврата Победителем товаров, работ (услуг) в предприятия торговли (сервиса), или установлен факт нарушения настоящих Правил в течение 22 календарных дней после признания Участника Победителем, то невыданные Призы остаются в распоряжении Организатора.

16.8. При получении следующих Призов: Диван Ikea «Ландскруна», Ноутбук Asus VivoBook, Телевизор Samsung, Холодильник с морозильником Liebherr, Портативная колонка JBL Charge 4, Готовая кухня Ikea «Кнюксульт», Кресло мягкое Ikea «Ландскруна», Горка Ikea «Бесто», Электрогриль Tefal GC306012, Смартфон Xiaomi Redmi Note 8 Pro 6Gb/64Gb, Робот-пылесос Xiaomi Mi Robot Vacuum Cleaner, Мультиварка Redmond SkyCooker RMC-M92S, Кофеварка-эспрессо Vitek VT-1522 BK, Умные часы Amazfit GTS / A1914, Аккумуляторная дрель-шуруповерт Bosch EasyDrill 1200, Микроволновая печь Samsung GE88SUW/BW Победители несут все права и обязанности по уплате подоходного налога в бюджет Республики Беларусь. Начисление, удержание и перечисление подоходного налога проводятся в порядке, установленном Особенной частью Налогового кодекса Республики Беларусь и осуществляются Организатором. Удержание с Победителей подоходного налога, исчисленного Организатором в соответствии с законодательством Республики Беларусь, производится Организатором (выступающим налоговым агентом) при выдаче Приза из денежной части Приза (денежного вознаграждения). Денежная часть Приза удерживается Организатором для уплаты подоходного налога в установленном размере.

17. **Комиссия по проведению Рекламной игры**

Для контроля соблюдения официальных Правил Рекламной игры, утверждением результатов, подведением итогов по результатам проведения Рекламной игры, рассмотрением спорных случаев, принятием решений по устным и письменным жалобам и замечаниям, возникшим при проведении Рекламной игры, Организатор создает Комиссию по проведению Рекламной игры в следующем составе:

Председатель комиссии – Лейкина Карина Александровна, ООО «Пиар квадрат», управляющий.

Члены комиссии:

Нахайчук Светлана Геннадьевна, ООО «Пиар квадрат», менеджер по реализации проектов;

Гончаренко Дарина Вячеславовна, ООО «Пиар Куб», ассистент менеджера по персоналу;

Шилинская Кристина Сергеевна, ООО «Пиар Куб», юрисконсульт;

Околович Марина Олеговна, ООО «Пиар Куб», ведущий специалист по маркетингу.

18. **Информация о Рекламной игре, публикация Правил Рекламной игры**

18.1. Правила Рекламной игры подлежат опубликованию в газете «Звязда» до начала Рекламной игры.

18.2. Результаты Рекламной игры будут опубликованы в газете «Звязда» в срок до 10 декабря 2020 г. включительно.

18.3. Информацию о правилах и условиях участия в Рекламной игре можно получить на сайте Рекламной игры, а также по телефону +375 (29) 632-61-00 (с 01.09.2020 по 25.12.2020). Время работы: ежедневно с 12.00 до 19.00 (стоимость звонка тарифицируется в соответствии с тарифами мобильного оператора, услугами которого пользуется Участник).

19. **Прочие условия**

19.1. Участие в Рекламной игре предполагает ознакомление и полное согласие Участников с настоящими Правилами и принятие на себя обязательства соблюдать все их условия и требования, согласие на получение SMS-сообщений и электронных уведомлений, предусмотренных настоящими Правилами, а также согласие на передачу персональных данных Организатору, разработчику личного кабинета и банку для целей обеспечения возможности участия в Игре.

19.2. Факт участия в Рекламной игре означает, что ее Участники соглашаются с тем, что их имена, фамилии, отчества, фотографии, видео-, аудио- и иные материалы о них могут быть использованы Организатором в любых рекламных и (или) информационных материалах, связанных с проведением Рекламной игры, без уплаты какого-либо вознаграждения Участникам. Победитель Розыгрышей дает свое согласие на интервью в средствах массовой информации и съемку для рекламных материалов, подготовленных в связи с проведением данной Рекламной игры, без выплаты ему какого-либо вознаграждения. Все права на такие рекламные материалы принадлежат Организатору.

19.3. Организатор не несет ответственности за работу сети Интернет при ее использовании Участником (например, за работу компаний, предоставляющих услуги сети Интернет Участнику), операторов сотовой передвижной электросвязи (плохое соединение с оператором и т. д.).

19.4. Организатор не несет ответственности за невозможность связаться с Победителями в случае недостоверной информации, предоставленной Участником.

19.5. Споры между Организатором и Участниками Рекламной игры рассматриваются в судебном порядке согласно законодательству Республики Беларусь.

Все возможные претензии Участников Рекламной игры в отношении организации Рекламной игры должны быть адресованы Организатору игры по адресу: РБ, 220030, г. Минск, а/я 171.

Свидетельство № 3842 о государственной регистрации рекламной игры, зарегистрированной 26 августа 2020 г., выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

Цэннікі леташнія, але гаспадары згодныя на зніжкі

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Вядома, апошнія падзеі паўплывалі на работу агенцтваў, але пры гэтым трэба разумець, што традыцыйны жнівеньскі ажыятаж нікуды не дзеўся. У тым, што людзі не памянялі сваіх планаў, рыэлтары пераканаліся ў другой палове апошняга месяца лета. Ажывілася як доўгатэрміновая арэнда, так і пасутачная.

Што датычыцца нейкіх глабальных змен на рынку арэнды, то іх няма: не памяняліся цэннікі, кватэры таксама нікуды не зніклі. Усё нібыта па старому, але... У сувязі з пандэміяй велізарная колькасць кватэр на суткі перайшла ў ранг доўгатэрміновай арэнды. А пры залішняй канкурэнцыі, як вядома, цэны нязменна зніжаюцца.

Попыт застаецца стабільны

На рынку арэнды кіруюць попыт і прапанова. Людзі тэлефануюць кожны дзень і пытаюцца пра варыянты. Як звычайна, самыя гарачыя аб'екты — недарагія і невялікія кватэры. Вядома, такога ажыятажу, як летам пазамінулага і мінулага гадоў, няма, але работа не спынілася.

Самы вялікі попыт — у сегменце стандартных кватэр коштам 250—300 долараў у месяц. У гэтым дыяпазоне цэн прапануюцца адна- і двухпакаёўкі. Менавіта такія апартаменты сёння шукаюць і глядзяць. Партал realt.by заняўся пошукам танных кватэр з цэннікам да 200 долараў. За адзін дзень удалося адшукаць каля дзесяці такіх аб'ектаў. Гэта першапачаткова было жыллё «на аматара» — старэнькая мэбля, пацёртая падлога і не зусім свежыя шпалеры. Але там сустракаліся і кватэры ў сучасных дзевяціпавярховых дамах або з амаль новай пральнай машынай.

Што датычыцца варыянтаў VIP-узроўню, то там усё ў рэжыме чакання. Паколькі попыт на гэтыя кватэры фарміраваўся ў асноўным замежнымі кліентамі, то сёння яго фактычна няма.

З чаго пачаць пошук?

У тых, хто жадае зняць кватэру, ёсць выбар сярод вялікай колькасці варыянтаў і цэн, і ў гэтым заключаецца першая цяжкасць — разгубіцца ў такой разнастайнасці лёгка. А яшчэ не хочацца пераплаціць або сутыкнуцца з ашуканцамі. Падчас пошуку арэнднага жылля чалавек аказваецца перад выбарам: шукаць праз агенцтва або рабіць гэта самастойна. У кожнага са спосабаў ёсць свае вартасці і недахопы.

Як знайсці кватэру праз агенцтва? Да гэтага варыянта часта прыходзяць ад нежадання займацца пошукам самастойна або па неспрактыкаванасці, калі чалавек, абзваніўшы з дзясятак аб'яў і пастаянна натыкаючыся на агентаў, вырашае, што іншага спосабу знайсці кватэру няма. На самай справе спосабы, вядома, ёсць.

Аднак баяцца агенцтваў не варта. Добры пасрэднік дазволіць вам сэканоміць час, нервы і зберажэ ад рызык. Плюсамі звароту да агента будуць легальнасць і празрыстасць здзелкі, праверка гісторыі кватэры і арэндадаўца прафесіяналамі, адсутнасць патрэбы марнаваць час на самастойны пошук жылля і афармленне неабходных дакументаў. Ну а мінус заключаецца ў тым, што давядзецца панесці дадатковыя выдаткі і аплаціць аказаныя паслугі. Добрасумленныя агенты, як правіла, бяруць плату толькі па факце засялення — абавязкова звяртайце ўвагу на гэты момант. Калі з вас патрабуюць перадаплату, вялікая імавернасць, што пасрэднік нядобрасумленны.

Сярэдні цэннік за падбор кватэры ў Мінску сёння складае 10 базавых велічынь, або 270 рублёў, але некаторыя агенцтвы прывязваюць сваю стаўку да цаны месячнай арэнды і могуць браць да 50 % ад яе.

Калі вы хочаце скарыстацца паслугамі агентаў і атрымаць якасны сэрвіс, лепш звяртацца ў буйныя кампаніі з добрай гісторыяй і вялікай колькасцю станоўчых водгукаў. Пры гэтым водгукі лепш глядзець у незалежных крыніцах, напрыклад на сайтах аб нерухомасці, не надта давяраючы водгукам з сайта самой кампаніі або рэкламным слоганам. Перад зваротам у агенцтва нерухомасці пашукайце сярод сваіх знаёмых тых, хто ўжо карыстаўся такімі паслугамі, распытайце іх пра ўражанні.

Агенцтва-«рыбалоў»

Высокі ажыятаж у сферы арэнды прыцягвае ў яе і ашуканцаў, і нядобрасумленных пасрэднікаў. Самая распаўсюджаная хітрасць нячыстых на руку агентаў — фэйкавыя аб'явы альбо аб'явы аб здачы ўжо здадзеных кватэр, якія працуюць як прынада.

Усе падобныя аб'явы радніць вельмі прывабная цана за добры варыянт жылля. Як гэта працуе? Калі вы тэлефануеце на паказаны нумар, вам называюць наступныя ўмовы: прыехаць у офіс, заключыць дагавор, аплаціць паслугі. Пасля гэтага «проста сёння» можна будзе паехаць паглядзець кватэру. Калі вы кажаце, што хочаце аплаціць паслугі па факце засялення, вам альбо адказваюць, што агенцтва працуе толькі па перадаплаце, альбо абяцаюць звязацца пазней і больш не ператэлефаноўваюць.

Тыя ж кліенты, хто згаджаецца, пасля аплаты даведваюцца, што кватэра, на жаль, ужо здадзена, але можна паглядзець іншыя варыянты (натуральна, ужо не такія прывабныя). А паколькі грошы аддадзены і дагавор падпісаны, мала хто выбірае проста развярнуцца і сысці — застаецца толькі супрацоўнічаць з такім агенцтвам.

Пяць правіл, якіх варта прытрымлівацца

Першае. Пры аглядзе жылля правярайце ўсё: сантэхніку, бытавую тэхніку, мэблю, вокны, дзверы. Складаючы дагавор арэнды, апісвайце ў ім стан усяго агледжанага, каб пазней не ўзнікла рознагалоссяў з уладальнікам.

Другое. Калі ўладальнік выклікае ў вас недавер або здаецца дзіўным, варта адмовіцца ад гэтай кватэры. У далейшым камунікацыя са складаным чалавекам можа моцна папсаваць нервы або прымусіць з'ехаць у нечаканы момант.

Трэцяе. Праверце пасведчанне аб праве ўласнасці ў таго, хто здае вам кватэру. Даныя ў пасведчанні і ў пашпарце павінны супадаць. Заключайце дамову толькі з гэтым чалавекам. Калі ўласнікаў некалькі, неабходны пісьмовы дазвол ад кожнага з іх.

Чацвёртае. Азнаёмцеся з гісторыяй камунальных плацяжоў. Так вы заб'яце адным стрэлам двух зайцоў: даведаецеся пра рэальны кошт «камуналкі» і праверыце, ці няма запазычанасці па выплатах, каб потым на вас не легла іх пагашэнне альбо ў кватэры не адключылі ваду ці святло.

Пятае. Заўсёды заключайце дагавор! Без выключэнняў. Гэта засцеражэ вас ад падману з боку ўладальніка і абароніць ад рызыкі апынуцца на вуліцы з рэчамі пасярод ночы.

Некалькі парад студэнтам

Аўтар гэтых радкоў са сваёй сяброўкай (а потым жонкай) цэлых 13 гадоў пражыў у Мінску на здымных кватэрах. Так што мае рэальны вопыт жыцця «на чамаданах». Вось вырашыў падзяліцца.

Не выбірайце сабе жыллё побач з інстытутам, універсітэтам, каледжам ці вучылішчам. Паверце, гэта неістотна. Больш за тое, здымаць жыллё ў аддаленых раёнах нават добра. Па-першае, так іншагароднім спачатку прасцей вывучыць горад. Па-другое, пакоі і кватэры не ў цэнтры могуць каштаваць адчувальна танней. Не варта баяцца доўгай дарогі на вучобу і дадому — на самай справе ў студэнцтве даволі шмат вольнага часу, да таго ж у дарозе можна нешта вучыць.

Калі вы студэнт, то лепш з гаспадаром жылля не «фінціць». Тут самае галоўнае — быць шчырым. Студэнту без вечарынак не абысціся: на вуліцы збірацца холадна, а ў кавярні — пакуль дорага. Варта сумленна папярэдзіць гаспадароў, што госці будуць, але вы гарантуеце чысціню і парадак. Увогуле, давядзецца пагаварыць па-даросламу. І паводзіць сябе адпаведна: не варта заводзіць коцікаў і сабачак, а потым хаваць іх ад гаспадароў. Усё роўна заўважаць.

Калі вы, напрыклад, знайшлі жыллё, якое выглядае прыстойна на фотаздымках і падыходзіць па цане, трэба стэлефанаваць з гаспадарамі, каб паглядзець кватэру на свае вочы. Калі пры знаёмстве арэндадавец здаецца вам хоць трошкі дзіўным — бяжыце. У будучыні гэтыя дзівацтвы выявяцца ў дзвесце разоў мацней. Гэта дакладна.

Бывае, класная кватэра засланяе розум, і не надта ўнікаеш, які гаспадар чалавек. А гэта важней: трэба адразу дамаўляцца пра распіскі і перавод грошай — лепш на картку, — умовы магчымых рамонтаў і гэтак далей. Я неяк зняў кватэру, зрабіў там мінімальны рамонт, а пасля яго цану за кватэру адразу павысілі. А потым увогуле папрасілі «на вуліцу».

Калі ўжо складаць дагавор, то трэба абавязкова зафіксаваць у ім іншыя важныя моманты: як вярнуць заклад (калі ён ёсць), стан кватэры (мэблі, тэхнікі, рамонту) да вашага ўезду. Дамовіцца трэба загадзя і пра тое, хто аплачвае камуналку. Калі гэта робіць гаспадар, прасіце паказаць плацежкі: могуць быць выпадкі, што вы аддаяце 60 рублёў, а рэальна арэндадаўцу патрэбна толькі 40.

Майце спіс рэчаў, якія абавязкова трэба праверыць. Па-першае, гэта вокны. Даведайцеся, ці не прадзьмувае, ці адчыняюцца рамы або яны забітыя. Лепш, каб стаялі шклопакеты, — старыя драўляныя рамы не самая надзейная рэч.

Потым ідуць сантэхніка і астатнія, здавалася б, дробязі. А насамрэч дробязяў няма, асабліва бачок у прыбіральні — не саромейцеся на ўсё націскаць і круціць краны, бо потым гэтым давядзецца карыстацца. Таксама трэба праверыць усю бытавую тэхніку: калі нешта зламанае, удакладніце, ці ў курсе гаспадар, што так ужо было. Гэта важна зафіксаваць, каб потым не расплачвацца за чужыя памылкі.

Будзьце гатовы з'ехаць у любы момант

Заўсёды ведайце, што гэта рэальнае жыццё. Нават з заключаным дагаворам трэба спадзявацца на лепшае, а разлічваць на горшае.

Аднойчы мы са сваёй будучай жонкай адзначалі мой юбілей (25 гадоў), ды так, што суседзі паскардзіліся гаспадарам. Яны прыехалі на наступны ж дзень і папрасілі мяне адразу з'ехаць, нягледзячы на заключаную дамову. Удалося дамовіцца на падаўжэнне тэрміну выселення на тыдзень, хоць наогул гэта гаспадары парушылі ўмовы дагавора. Я тады гэтага не ведаў, а таму не стаў адстойваць свае правы.

І яшчэ. Цэны на кватэры могуць змяніцца ў залежнасці ад сезону. Напрыклад, у канцы ліпеня (сёлета пазней) попыт на жыллё расце, а значыць, могуць і цэны. Пік спадае дзесьці да канца лістапада. Да наступнага лета ўсё застывае на адным узроўні. Таму можна пажыць пару месяцаў у кагосьці і шукаць свой варыянт потым або задумацца над пошукам кватэры загадзя.

Сяргей КУРКАЧ.

Карысна ведаць

Кансультацыя да 1 верасня

Акцыю па бясплатнай прававой дапамозе грамадзянам у Дзень ведаў правядуць натарыусы Мінскай абласной натарыяльнай палаты.

Цягам дня ва ўсіх натарыяльных бюро і канторах сталічнай вобласці можна будзе атрымаць кансультацыю наконт таго, як афарміць спадчыну, скласці завяшчанне, што прапісаць у шлюбным дагаворы, каму магчыма падарыць маёмасць, а таксама высветліць іншыя пытанні, якія датычацца кампетэнцыі спецыялістаў натарыята.

Поўны спіс натарыяльных бюро і кантор, а таксама час іх работы можна знайсці на сайце Беларускай натарыяльнай палаты belnotary.by.

Акрамя таго, тэрытарыяльныя палаты БНП актыўна ўдзельнічаюць у рэспубліканскай дабрачыннай акцыі «Збяром партфель да школы». Падрыхтаваныя заплечнікі з канцылярскімі прыладамі перадаюцца першакласнікам са шматдзетных і малазабяспечаных сем'яў.

Ірына СІДАРОК.

Анонс

ПОШУК РОДНЫХ АДРАСОЎ

Тэма суайчыннікаў заўсёды мае свае актуаліі. Гісторыя папярэдніх дзесяцігоддзяў, савецкі перыяд часу, ды і ранейшыя стагоддзі накладвалі сваю пячатку на міграцыйныя працэсы. І беларусы, як высвятляецца, паўсюль былі запатрабаваныя. Таму і ўвага дзяржавы да стварэння гісторыі гэтых працэсаў — і дакументальнай, і мастацка-публіцыстычнай — выяўляецца заўсёды.

Як прыклад — наступны праект. Выдавецкі дом «Звязда» выконвае падпраграму «Беларусы замежжа» Дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі». У яе межах, пачынаючы з 2017 года, пабачылі свет некалькі тамоў у агульнай серыі «Адрасы Беларусі ў свеце».

Вось і сёлета пры падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь і Міністэрства замежных спраў нашай краіны павінна выйсці кніга «Родны небасхіл у сэрцы» ў дзвюх частках. У першай будзе ісці расповед пра лёсы нашых суайчыннікаў у Расіі, пра тыя мясціны Расіі, якія так ці іначай звязаны з Беларуссю. Другая частка, другі том — пра беларускую повязь з краінамі Цэнтральнай Азіі: Казахстанам, Кыргызстанам, Туркменістанам, Таджыкістанам, Узбекістанам.

Чытача чакае сустрэча з лёсамі пісьменнікаў, археолагаў, падарожнікаў, вучоных розных спецыяльнасцяў, акцёраў, рэжысёраў, мастакоў, якія засведчылі сябе справамі ў розных старонках свету. Назавём імёны хоць бы некаторых нашых суродзічаў, пра якіх расказваюць розныя аўтары, — Мікола Калінковіч, Міхась Карпенка, Зінаіда Марская, Мікіта Брылёў, Сяргей Юрэневіч...

Сяргей ШЫЧКО.

Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 27 (515)

Не прапусціце!

НОВЫ СЕЗОН У ЖЫЦЦІ ТЭАТРАЎ

Новы сезон — гэта заўсёды магчымасць прапанаваць гледачам цікавыя творы, а таксама ўласнае іх прачытанне, арыентуючыся на сучаснага гледача. Напярэдадні 88-га тэатральнага сезона свае планы агучылі ў двух сталічных тэатрах.

Так, нядаўна адбыўся сход калектыву **Вялікага тэатра Беларусі**, які традыцыйна праводзіцца напярэдадні новага сезона. «У нас у верасні будуць прадстаўлены два новыя спектаклі — балет «Пер Гюнт» на музыку Эдварда Грыга ў пастаноўцы маладога харэографа Сяргея Мікеля і опера Джакама Пучыні «Вілісы. Фатум» рэжысёра Аксаны Волкавай. Прэм'еру новай рэдакцыі балета «Шчаўкунок» у пастаноўцы Валянціна Елізар'ева гледачы ўбачаць у кастрычніку.

У лістападзе да паказу плануецца прэм'ера оперы Шарля Гуно «Фауст» рэжысёра-пастаноўшчыка Ганны Маторнай. Юным гледачам у снежні прадставім дзіцячую оперу Глорыі Бруні «Пінокіа» (па матывах казкі Карла Калодзі) у пастаноўцы маладога рэжысёра Наталлі Бараноўскай. А вось у 2021 годзе балет «Лебядзінае возера» будзе прадстаўлены ў папярэдняй, традыцыйнай рэдакцыі Асафа Месерэра», — падзяліўся планамі мастацкі кіраўнік тэатра Валянцін Елізар'еў.

Дырэктар тэатра Яўген Пятровіч павіншаваў супрацоўнікаў з атрыманнем высокіх дзяржаўных узнагарод. У калектыве ганаровага звання «Народны артыст Беларусі» ўдастоены саліст оперы — вядучы майстар сцэны Уладзімір Громаў.

Ганаровае званне «Заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь» атрымала артыстка аркестра — вядучы майстар сцэны Ларыса Ласоцкая; ганаровага звання «Заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь» удастоены дырыжор Андрэй Галанаў. А вядучы майстар сцэны Аляксей Афанасьеў, дырыжор Іван Касцяхін і артыстка хору Святлана Цітова ўзнагароджаны медалём Францыска Скарыны.

Акрамя гэтага, у новым сезоне ў Вялікім тэатры адбыліся і кадравыя абнаўленні: на сустрэчы прадставілі новага загадчыка трупы оперы лаўрэата міжнародных конкурсаў мецца-сапрана Наталлю Анікіну.

Таксама кіраўніцтва тэатра агучыла рашэнне, што ў верасні праводзіць дабрачынную акцыю, якая дае магчымасць бясплатна наведваць усе спектаклі людзям з абмежаванымі магчымасцямі, пенсіянерам, шматдзетным сем'ям, дзецям-сіротам, медыцынскім супрацоўнікам і студэнтам.

Наведвальнікаў **Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Максіма Горкага** чакаюць таксама абноўленая праграма і завяршэнне рамонту на вялікай сцэне. Тут у новым сезоне плануюць пастаноўку спектакля «Браты Карамазавы» па рамане Фёдара Дастаеўскага, аднаўленне спектакля «Адзіны наследнік» па п'есе Жана-Франсуа Рэньяна (ад рэжысёра-пастаноўшчыка Вольгі Дзянісавай). Убачаць гледачы таксама мюзікл «Граф Монтэ-Крыста» ў пастаноўцы мастацкага кіраўніка тэатра Сяргея Кавальчыка, а Валянціна Еранькова прадставіць публіцы «Трамвай «Жаданне» па п'есе Тэнесі Уільямса. Плануе калектыў аднавіць і сваю гастрольную дзейнасць, у тым ліку ўдзел у разнастайных фестывалях. Падчас сустрэчы з калектывам Сяргей Кавальчык адзначыў, што для акцёра галоўная трыбуна — гэта сцэна, на якой ён можа і павінен несці людзям ідэалы міру, гуманізму і дабра.

Фота з сайта https://bolshoibelarus.by.

Брэнды

ТРАДЫЦЫІ І НАВАЦЫІ ФЕСТЫВАЛЬНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Фестывальная дзейнасць у галіне культуры і мастацтва — адна з найбольш эфектыўных сацыяльна-культурных тэхналогій. Яна дазваляе рэалізаваць творчыя магчымасці, падзяліцца дасягненнямі як прафесійных, так і аматарскіх мастацкіх калектываў і асобных выканаўцаў. Але падчас прэс-канферэнцыі на тэму «Рэгіянальныя фестывалі як брэнд Беларусі. VI Міжнародны фестываль этнакультурных традыцый «Покліч Палесся» яе ўдзельнікі прыйшлі да высновы, што мерапрыемствы такога кшталту могуць мець значна большы патэнцыял.

— Фестываль народнай мастацкай творчасці заўсёды адлюстроўвае развітасць пэўных відаў і жанраў мастацтва, характарызуецца комплексным вырашэннем мастацка-эстэтычных, навукова-метадычных і матэрыяльна-тэхнічных задач, — лічыць **начальнік аддзела метадычнага забеспячэння дзейнасці клубных арганізацый Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур Раіса ВАЙЦЯХОЎСКАЯ.**

Штогод у Беларусі праводзіцца больш за сотню фестываляў, многія з якіх ужо даўно сталі традыцыйнымі. Напрыклад, фестываль музыкі «Звіняць цымбалы і гармонік» у Паставах, міжнародны фестываль песні і музыкі «Дняпроўскія галасы» ў Дуброўне, міжнароднае свята традыцыйнай культуры «Браслаўскія зарніцы», рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва «Берагіня», «Мотальскія прысмакі» Іванаўскага раёна, міжнародны фестываль харэаграфічнага мастацтва «Сожскі карагод», «Покліч Палесся» і многія іншыя. Спалучэнне традыцый і навацый у фестывальнай дзейнасці выклікае ў жыхароў рэгіёнаў цікавасць і станоўчы рэзананс. Актуальнасць і прыцягальнасць мастацкіх ідэй, пакладзеных у аснову гэтых свят, з'яўляюцца ўмовай іх укаранення ў тым ці іншым рэгіёне. У гэтых мясцовасцях фестывальныя мерапрыемствы атрымліваюць моцную грамадскую падтрымку, спрыяюць аб'яднанню намаганняў розных грамадскіх структур, скіроўваюць інтэлектуальныя, фінансавыя, кадравыя рэсурсы на вырашэнне найбольш актуальных праблем культуры ў рэгіёнах.

Спецыяліст таксама адзначыла, што, як паказвае практыка, на працягу апошніх 30 гадоў фестывальная дзейнасць заставалася адной з найбольш эффектыўных формаў захавання, развіцця і папулярызацыі народнага мастацтва. Фестывалі народна-мастацкай творчасці ў Беларусі выконваюць сваю асноўную задачу — узнаўляюцца нацыянальныя традыцыі, узбагачаецца культурнае жыццё краіны, рэгіёнаў, ствараецца максімальна шырокае поле прыцягнення як для прафесіяналаў, так і для шырокай аўдыторыі гледачоў да беларускай мастацкай культуры. Разам з тым такія мерапрыемствы дапамагаюць скіроўваць увагу дзяржавы і грамадскіх арганізацый, устаноў культуры, творчых саюзаў, дабрачынных фондаў, дзеячаў культуры і мастацтва да праблем захавання нацыянальнай культуры, эстэтычнага выхавання дзяцей, падлеткаў, моладзі на прыкладзе найлепшых узораў традыцыйнага мастацтва. У дадатак фестывальная дзейнасць спрыяе развіццю турызму.

Наглядна можна прааналізаваць сітуацыю на прыкладзе міжнароднага фестывалю этнакультурных традыцый «Покліч Палесся». Ён сёлета праходзіць 29 жніўня і збярэ сваіх прыхільнікаў ужо шосты раз. Штогод у аграгарадку Ляскавічы Петрыкаўскага раёна Гомельскай вобласці сустракаюцца творчыя калектывы, майстры народных рамёстваў і розныя іншыя спецыялісты. Дэманструючы ўласны вопыт і наладжваючы кантакты з калегамі па цэху, наведвальнікамі, яны пашыраюць магчымасці сваёй творчай (у тым ліку і гастрольнай) дзейнасці.

— Фестываль збярэ сёлета творчыя калектывы, майстроў і рамеснікаў з васьмі раёнаў Гомельскай і трох раёнаў Брэсцкай вобласці. Варта адзначыць, што не было ніводнага фестывалю, каб да нас не прыязджалі замежныя госці, — дзеліцца **начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама Дзяніс ЯЗЕРСКІ.** — Рэжысёрска-пастановачная група распрацавала канцэпцыю, якая дазволіць наведвальнікам пранікнуцца атмасферай прыпяцкага Палесся, атрымаць багатыя ўражанні і эмоцыі. Асаблівасцю гэтага года стала тое, што тэрыторыя, дзе праводзіцца свята, прайшла праз рэканструкцыю, і цяпер усе мерапрыемствы будуць сканцэнтраваны ў адным месцы. (Гісторыка-этнаграфічны комплекс «Музей пад адкрытым небам» з пачаткам фестывалю прыме сваіх першых наведвальнікаў. — **Аўт.**) Там будуць размешчаны і сцэнічная пляцоўка, і падвор'і, што дазволіць лягчэй арыентавацца гасцям. Наша мерапрыемства сёлета — гэта яшчэ адна яскравая турыстычная кропка на карце краіны.

Паколькі тая рэканструкцыя, якую правёў Нацыянальны парк «Прыпяцкі», і той музей пад адкрытым небам, які ў нас з'явіўся, заслугоўваюць увагі наведвальнікаў.

На працягу свайго існавання «Покліч Палесся» пастаянна трансфармуецца, абрастаючы новымі традыцыямі, ідэямі і мерапрыемствамі. Так, напрыклад, сёлета ўпершыню адбудуцца канцэртна-гульнявыя выступленні аўтэнтычных калектываў і культарганізатараў «Фолькфэст» (туды прыйшло каля 50 заявак). Госці пабываюць на абсалютна розных пляцоўках, дзе будуць праводзіцца народныя гульні з далучэннем да інтэрактыўнага дзейства. Прагучаць аўтэнтычныя канцэртныя праграмы.

Вядома, не абыдзецца і без выступленняў творчых калектываў. Тут заўсёды рады бачыць гасцей і са сталіцы, і з суседніх краін. Сёлета ў мерапрыемстве возьмуць удзел калектывы — вакальны гурт «Чысты голас», нацыянальны акадэмічны Народны хор Цітовіча, ансамбль народнай музыкі «Бяседа». З Расіі чакаюць тэатр танца «Віп-пакаленне», фальклорны калектыў «Макоша» з Бранскай вобласці. Таксама арганізатарам удалося запрасіць адзін з найпапулярнейшых калектываў Украіны «Лесапетны батальён» з Івана-Франкоўскай вобласці.

Сярод навінак — правядзенне «Мазырскага эканамічнага форуму», які таксама прымуць у рамках фестывалю. На першы погляд, мерапрыемства быццам не ўпісваецца ў палітру «Поклічу Палесся», але варта паглядзець шырэй, бо такі падыход, на думку арганізатараў, дазволіць удзельнікам форуму пазнаёміцца з турыстычным, культурным патэнцыялам мясцовасці, глыбей і шырэй спазнаць Палесскі рэгіён.

Увогуле пры жаданні і ўменні бачыць магчымасці людзі знаходзяць іх і рэалізуюць задуманае. І жывуць, працуючы не дзеля чарговай галачкі «прайшло свята», а на перспектыву. Бо, напрыклад, той жа музей пад адкрытым небам — гэта тое, што дапоўніла і пашырыла інфраструктуру Нацыянальнага турыстычнага парку «Прыпяцкі». А значыць, з'явілася больш варыянтаў для адпачынку, новая лакацыя для культурных сустрэч і месца, дзе працягваюць жыць традыцыі беларускай культуры.

Алена ДРАПКО.

Фота з архіва npp.by.

Пазакласнае чытанне

У часопісе «Полымя» пачынае друкавацца новы раман Людмілы Рублеўскай «Авантуры Вырвіча, Лёдніка і Чорнай Меланхоліі». Гэта шостая кніга вядомай авантурна-прыгодніцкай серыі пра шляхцюка Пранціша Вырвіча герба Гіпацэнтаўр і яго старэйшага сябра, полацкага доктара Баўтрамея Лёдніка. Прапануем чытачам «Звязды» пазнаёміцца з урыўкам з гэтага твора. Дзеянне адбываецца ў XVIII стагоддзі, у апошнія гады існавання Рэчы Паспалітай. Заканчваецца праўленне ўсемагутнага канцлера Антонія Тызенгаўза, інтрыгі якога зноў гоняць герояў у далёкую дарогу. Пранціш Вырвіч цяпер — шаноўны суддзя падкаморы, Баўтрамей Лёднік — паплечнік стваральніка медычнай акадэміі Жана Жылібера, жонка Лёдніка, чароўная Саламея, таксама займаецца лекарскай справай, а ягоная падрослая дачка Сафійка ўспадчыніла не толькі матчыну гожасць, але і неўтаймоўны бацькаў характар. І зноў — захапляльнае падарожжа па трагічных і яркіх старонках беларускай гісторыі.

Пачатак рамана чытайце ў № 8 часопіса «Полымя», працяг — у №№ 9 і 10.

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ

Урывак з рамана

«АВАНТУРЫ ВЫРВІЧА, ЛЁДНІКА І ЧОРНАЙ МЕЛАНХОЛІІ»

РАЗДЗЕЛ ДРУГІ. ЯК ЛЁДНІКІ З ГРАФАМ МАНУЦЫ ПАЗНАЁМІЛІСЯ

Як сведчаць летапісы, у лета шэсць тысяч шасцісотае ад стварэння свету было на Полацак нашэсце наўяў. Гойсалі мерцвякі па вуліцах, саміх не відаць было, а вось сляды капытоў іхніх коней палачане бачылі выразна. Можа, прывідныя коні проста занадта хутка несліся для вока чалавечага, як умеюць чорныя духі гарцукі, якія возяць па небе агромністы вогненны жоран з паганскім Перуном?

Чацвёрка сытых чорных коней пёрла па старажытнай Альгердавай дарозе між Полацкам і Вільняй шыкоўную карэту, пазалочаную, з гербамі, так імкліва, нібыта ў ёй выправіліся на зладзейскую справу наўцы альбо хтосьці зацугляў перуновых гарцукоў. Лужыны ператвараліся ў феерверкі бруду, гасцінец ажно дрыжэў...

Ніхто не прытрымаў чорных коней, нават бачачы, што наперадзе валюхаецца грувасткі рыдван. Дарэмна два фурманы, што кіравалі рыдванам, чарнявы дзяцюк з квадратнымі плячыма і бялявы хлапец-мацак, спрабавалі адвесці свой экіпаж убок... Шалёная залачоная карэта дагнала рыдван якраз у самым нязручным месцы дарогі, калі з аднаго боку было густое кустоў'е, з з другога — узгорак, на які ўскарасквалася танклявыя бярозкі.

Хрась!.. Залаты бок карэты ледзь не прыхіліўся да чорнай сценкі рыдвана, задні колы экіпажаў сутыкнуліся, быццам няўважліваму шкаляру аднакласнік спрытна падставіў нагу... Вось і прыехалі. Без кола засталіся. А да Гародні ўсяго два пераезды!

Красамоўства фурманаў абедзвюх павозак змусіла б вядомага грэка Дэмасфена тэрмінова набраць у рот каменьчыкаў і зноў бегчы на бераг мора, трэніравацца ў вымаўленні складаных сінтаксічных фігур, няхай не дужа прыстойных.

Сітуацыю маглі ўладзіць толькі гаспадары. Пакуль Саламея супакойвала раз'юшанага Лёдніка, які ад штуршка ледзь не паляцеў на падлогу, Пранціш самавіта выйшаў з пахіленага рыдвана, паклаўшы руку на дзяржальна Гіпацэнтаўра. Гаспадар залачонай карэты не зрабіў ласку выйсці, але ягоны слуга ў венгерцы з залатымі галунамі расчыніў дзверцы, каб пан мог высунуцца вонкі і пакараць дзёрзкі сусвет.

Пан быў даволі гожы, гэткай саладжавай гожасцю, якую цэняць у куртуазных свецкіх салонах: чорныя выразныя вочы, акуратны нос, не кірпаты і не дзюбаты, румяныя шчокі, невялікі капрызны рот. Парыс, каб яго цапамі малацілі. Праўда, цяпер гожае аблічча псавала злосць.

— Вашыя фурманы мусілі збочыць.

Ружовыя вусны ўладальніка залачонай карэты буклямі, мушка на правай шчацэ... Лыткі, мусіць, накладныя, як цяпер модна. Нібыта не ў дарогу выправіўся, а на баль. Што за фацэт? Вырвіч зірнуў на герб на баку карэты: залаты леў, вельмі падобны да венецыянскага, вежа, якар, рука з трыма ружамі... Падобна, гэткі стракаты герб нядаўна зацвердзілі. І ўладальнік нетутэйшы, з акцэнтам гаворыць, і звычаяў сармацкіх не ведае — не прадставіўся пану-брату. Пранціш паклаў руку на дзяржальна Гіпацэнтаўра, другой рукой паправіў шапку сабаліную з дыяментавым гузам, выпрастаўся, каб аксамітная дылея лягла прыгожымі складкамі паўзверх жупана.

— Франтасій Вырвіч з Падняводдзя, герба Гіпацэнтаўр, старэйшая лінія роду, падкаморы менскага павета. З кім маю гонар размаўляць?

Фацэт падумаў, неахвотна выйшаў з карэты, грэбліва пераступіўшы па беларускай гразі, якая адразу ганарыста крывіліся, пальцы правай рукі, знізаныя пярсцёнкамі паўзверх тонкай шаўковай пальчаткі, барабанілі па сценцы. А камзол парчовы, карункі галандскія, панчохі белыя, чаравікі на чырвоных абцасах, з дыяментавымі спражкамі, парычок пудраны з акуратнымі засмактала ягоныя чырвоныя абцасы.

— Граф Нікола Антоній Мануцы, староста Опсаўскі.

А бож-жачкі, гонару колькі ў італьянчыка, як блох у бадзяжнага сабакі... Вырвіч ветліва схіліў галаву, стрымліваючы паблажлівую ўсмешку. Дык вось ён які, Мануцы, самазваны графчык! Прыехаў у Польшчу з Венецыі некалькі год таму, укруціўся ў давер да Панятоўскага, выконваючы самыя слізкія даручэнні... Дапамагчы з упадабанай красунькай сустрэцца, таго, хто перашкаджае, настрашыць, скалечыць ці са свету прыбраць... Хаця на першы погляд мала быў падобны да брэцёра. Нарэшце, венецыянец аказаў Цялку такую паслугу, якую не забываюць: ажаніўся з Ядвігай Струтынскай, амараткай караля, што трапіла ў цікавае, але непрыемнае становішча. Пані Ядвіга шылахвосткай была вядомай, першы яе муж, Цеханавецкі, з ёй са скандалам развёўся, з-за гожых вочак паненкі тады ў Рэчыцы цэлае пабоішча выйшла, з ахвярамі... І каралеа акруціла. Цяпер у сям'і графа гадаваўся маленькі Станіслаў Мануцы, па водгуках усіх — выліты Цялок. Сам Мануцы выдаваў сябе за нашчадка старажытнага венецыянскага роду, вось і змайстрачылі яму герб... А паралельна самазваны граф пасябраваў з расійскім паслом Штакельбергам і наладзіў сувязь з каханкам расійскай імператрыцы Пацёмкіным. Так што шпегаваў увішны італьянчык, сябручок такога ж падлючага авантурыста Казановы, на абодва бакі, а мо на тры ці чатыры. Такога ў бутэльку закаркуй — выслізне.

Між тым слугі абодвух экіпажаў узяліся правіць папсаваныя колы. А размова Пранціша з графчыкам набыла небяспечны паварот. Вырвіч справядліва лічыў, што вінаваты ў прыкрым сутыкненні ўладар залачонай карэты. Гэта ягоныя слугі мусілі прытрымаць коней.

Мануцы намякнуў, што спяшаецца ў інтарэсах караля.

Пранціш ганарыста заявіў, што яны выконваюць загад падскарбія, знакаміты доктар Баўтрамей Лёднік мусіць як найхутчэй з'явіцца ў Гародню.

Пачуўшы імя Чорнага Доктара, Мануцы змяніўся. Цёмныя вочы загарэліся азартам, ноздры вытанчанага носа драпежна разадзьмуліся, рука ў шаўковай пальчатцы сціснула дзяржальна шпагі... І раптам: заміж спешчанага хатняга сабачкі перад вамі — ікласты хорт, які лёгка ўчэпіцца ў загрывак. А ці праўда, што доктар Лёднік такі выбітны фехтавальшчык, што можа адзін выстаяць супраць дваццаці чалавек? А як ён па сценах скача? Забіць няўзброенай рукой, не дакранаючыся — таксама можа? Ці гэта плёткі? А ці згодзіцца пан доктар нешта прадэманстраваць?

Кадры з фільма «Авантуры Пранціша Вырвіча».

(Заканчэнне ў наступным нумары «Звязды».)

ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 8 октября 2020 года проводит 18-й открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности

Номер лота	Наименование техники	Местонахождение объекта	Начальная цена продажи (бел. руб.)	Сумма задатка (бел. руб.)
202	Специальный автомобиль КамАЗ-4310 с кузовом-фургоном К1-4320Д в составе: кузов-фургон К1-4320Д № 091770 1987 г. *4 кат.*, автошасси КамАЗ-4310 ш. 0034739 дв. 0128030 1987 г. *4 кат. 25515 км*	г. Осиповичи, в/ч 01313	13 000,00	2 600,00
203	Специальный автомобиль КамАЗ-4310 с кузовом-фургоном К1-4320Д в составе: кузов-фургон К1-4320Д № 101909 1988 г. *4 кат.*, автошасси КамАЗ-4310 ш. 0035630 дв. 0141717 1987 г. *3 кат. 1000 км*	г. Осиповичи, в/ч 01313	14 000,00	2 800,00
204	Специальный автомобиль КамАЗ-4310 с кузовом-фургоном К1-4320Д в составе: кузов-фургон К1-4320Д № 12631 1991 г. *2 кат.* Автошасси КамАЗ-4310 ш. 0025603 дв. 0728563 1990 г. *3 кат. 1897 км*	г. Осиповичи, в/ч 01313	14 000,00	2 800,00
205	Специальный автомобиль Урал-43203-01 с кузовом-фургоном К2-4320 в составе: кузов-фургон К2-4320 № 12106 1989 г. *4 кат.*, автошасси Урал-43203-01 ш. 144289 дв. 582934 1990 г. *4 кат. 5951 км*	г. Осиповичи, в/ч 01313	10 000,00	2 000,00
206	Специальный автомобиль Урал-43203-01 с кузовом-фургоном К2-4320 в составе: кузов-фургон К2-4320 № 07164 1989 г. *4 кат.*, автошасси Урал-43203-01 ш. 129131 дв. 480340 1989 г. *4 кат. 4855 км*	г. Осиповичи, в/ч 01313	10 000,00	2 000,00
207	Специальный автомобиль ГАЗ-66 с кузовом-фургоном КУНГ-1М в составе: кузов-фургон КУНГ-1М № б/н-207417 1973 г. *4 кат.*, автошасси ГАЗ-66 ш. 4-292518 дв. 227345 1971 г. *4 кат. 8913 км*	г. Осиповичи, в/ч 01313	3 500,00	700,00
208	Специальный автомобиль ГАЗ-66-05 с кузовом-фургоном К-66Н в составе: кузов-фургон К-66Н № 14579 1979 г. *4 кат.*, автошасси ГАЗ-66-05 ш. 0408990 дв. 106523 1979 г. *4 кат. 3276 км*	г. Осиповичи, в/ч 01313	3 200,00	640,00

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж **8 октября 2020 г. в 10.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительные и другие необходимые документы до **15.00 5 октября 2020 года.**

Заключительная регистрация участников аукциона будет производиться **8 октября 2020 г. с 9.00 до 9.45.**

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3 банковских дней с момента проведения аукциона.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение **5** банковских дней для резидентов Республики Беларусь и **10** банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 белорусского рубля за участие по каждому лоту и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»:

белорусские рубли – р/с BY12BELB30120002R20010226000, российские рубли – р/с BY64BELB30120002R20040226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», ул. Заславская, 10, код BELBBY2X, УНП 101099370, ОКПО 37401662. Корреспондент – ПАО «Сбербанк», г. Москва, № корсчета 30101810400000000225. Реквизиты банка: БИК 044525225, ИНН 7707083893, к/с в ОАО «Банк БелВЭБ» № 30111810800000000659. SWIFT/BIC: SABRRUMM. Без НДС.

Справки по тел./факс (017) 398-05-41.

РЕЗУЛЬТАТЫ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

«Авто от Мастеркард. Июль»

Организатор рекламной игры: ЗАО «Сэлмон-Графикс».

Юридический адрес: 220073, г. Минск, ул. Ольшевского, д. 22, пом. 39, офис 603, УНП 100843219, зарегистрировано решением Минского горисполкома от 2 декабря 2008 г.

Рекламная игра называется «Авто от Мастеркард. Июль».

Срок проведения рекламной игры: в период с 01 июля 2020 года по 04 сентября 2020 года (включая периоды розыгрышей и вручения призов).

Территория проведения рекламной игры: автозаправочные станции предприятий по нефтепродуктообеспечению, входящих в состав Государственного производственного объединения «Белоруснефть», находящихся в Республике Беларусь.

Свидетельство № 3804 о государственной регистрации рекламной игры, зарегистрированной 17 июня 2020 г., выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

В рекламной игре приняли участие 158 938 физических лиц.

Призовой фонд разыгран полностью.

Победитель рекламной игры «Авто от Мастеркард. Июль»

Главный приз № 1 – Автомобиль Volkswagen Polo G Trendline FL, № кузова XW8ZZZ61ZLG035455, и денежные средства для уплаты налога в размере 3 563,79 (три тысячи пятьсот шестьдесят три белорусских рубля 79 копеек)

№ п/п	№ Шанса	Номер карты	ФИО победителя	Населенный пункт
1	088 101	2000014522329	Деницик Дмитрий Сергеевич	Лида

Телефон горячей линии по вопросам проведения рекламной игры: (МТС – 033, А1 – 029, Life – 025) 6 431 431, круглосуточно.

ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «Авто от Мастеркард. Сентябрь»

1. Организатор Рекламной игры

Закрытое акционерное общество «Сэлмон-Графикс» (далее – Организатор), УНП 100843219, адрес: 220073, г. Минск, ул. Ольшевского, д. 22, пом. 39, офис 603.

Заинтересованным лицом Рекламной игры является общество с ограниченной ответственностью «Рефорте», УНП 100422707 (далее – Заинтересованное лицо).

2. Наименование и территория проведения Рекламной игры

Рекламная игра носит название «Авто от Мастеркард. Сентябрь» (далее – Игра) и проводится на территории автозаправочных станций предприятий по нефтепродуктообеспечению, входящих в Государственное производственное объединение «Белоруснефть» (далее – ПО «Белоруснефть»), находящихся в Республике Беларусь.

3. Срок начала и окончания Игры

Игра проводится с 01 сентября 2020 г. по 05 ноября 2020 г. (включая периоды розыгрышей и вручения призов).

4. Комиссия по проведению Игры

Для проведения Игры Организатор утверждает комиссию по проведению Игры (далее – Комиссия) в составе 5 человек, в том числе председателя Комиссии.

Состав Комиссии:

1. Лукашевич Ольга Леонидовна – индивидуальный предприниматель – управляющий ЗАО «Сэлмон-Графикс» – председатель комиссии;

2. Стельмах Александр Петрович – заместитель директора по правовым вопросам ООО «Медиа Крама»;

3. Василькова Елена Александровна – ведущий специалист отдела рекламных проектов ЗАО «Сэлмон-Графикс»;

4. Садовская Диана Сергеевна – специалист отдела рекламных проектов ЗАО «Сэлмон-Графикс»;

5. Расько Екатерина Александровна – экономист по договорной работе ООО « Сэлмон Медиа».

5. Наименование товаров/услуг, в целях стимулирования реализации которых проводится Игра

Игра проводится в целях стимулирования использования банковских платежных карточек международной платежной системы Mastercard (далее – Карта Mastercard), за исключением карт Maestro и Белкарт/ Maestro, для оплаты топлива на автозаправочных станциях предприятий по нефтепродуктообеспечению, входящих в ПО «Белоруснефть».

6. Условия, при соблюдении которых физическое лицо становится участником Игры

6.1. К участию в Игре допускаются совершеннолетние (достигшие 18 лет) граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие в Республике Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, являющиеся держателями действующей банковской карты Mastercard, за исключением карт Maestro и Белкарт\Maestro с учетом ограничений, указанных в данных правилах (далее – Участник Игры).

6.2. Участником Игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства, члены Комиссии.

6.3. Для участия в Игре необходимо выполнить следующие условия:

в период с 01 сентября 2020 г. по 30 сентября 2020 г. включительно совершить покупку топлива по собственной Карте Mastercard, за исключением карт Maestro и Белкарт/Maestro, на АЗС сети ПО «Белоруснефть» на сумму не менее 1 (одного) белорусского рубля одним чеком с использованием собственной зарегистрированной накопительной информационно-учетной карты (в дальнейшем – Карта «Заправка»), которая определяет физическое лицо как участника программы поощрения клиентов (физических лиц) ПО «Белоруснефть» (далее – Программа «Заправка»), проводимой на АЗС сети «Белоруснефть».

Зарегистрированной считается Карта «Заправка» при указании ее владельцем в анкете регистрации следующих достоверных данных: фамилии, имени, отчества (при наличии), даты рождения, номера мобильного телефона операторов сотовой связи в международном формате, населенного пункта, а также адреса электронной почты.

6.4. Участник Игры может участвовать в Игре только один раз независимо от количества и сумм совершенных покупок.

7. Состав и размер призового фонда и источники его формирования

Размер призового фонда игры составляет **32 533,10** (тридцать две тысячи пятьсот тридцать три) белорусских рубля 10 копеек. Состав призового фонда:

Наименование	Количество, шт.	Стоимость за единицу, бел. руб.	Общая стоимость, бел. руб.
Автомобиль: HYUNDAI ACCENT F/L (HCr) Год выпуска: 2020 Цвет кузова: красный перламутр (R4R) Номер кузова: Z94K241CAMR220769	1	**28 322,00**	**32 533,10**
И денежные средства для уплаты налога в размере **4 211,10** белорусского рубля	1	**4 211,10**	

Источником формирования призового фонда Игры являются денежные средства Заинтересованного лица – ООО «Рефорте».

8. Проведение розыгрыша призового фонда

8.1. Место, дата и время проведения розыгрыша

Розыгрыш призового фонда проводится открыто в присутствии Комиссии по адресу: г. Минск, пр. Победителей, 143 (АЗС № 23 РУП «Белоруснефть–Минскавтозаправка»).

Дата и время проведения розыгрыша: 12 октября 2020 г. в 18.30.

8.2. Порядок проведения розыгрыша призового фонда, в том числе порядок определения победителей

8.2.1. Для розыгрыша в установленном порядке формируется список участников (далее – Список) с указанием даты первой транзакции, соответствующей условиям Рекламной игры, присвоенного номера Шанса, номера Карты «Заправка», фамилии, имени, отчества (при наличии) участника, даты рождения, электронного адреса, телефона и населенного пункта.

Каждому Участнику Игры, выполнившему условия, указанные в подпункте 6.3. данных Правил, присваивается номер Шанса по номеру Карты «Заправка» в порядке возрастания. Все номера Шансов имеют одинаковую разрядность.

8.2.2. Для проведения розыгрыша используется специальный вращающийся непрозрачный барабан и набор шаров в количестве 10-ти штук с номерами от 0 по 9.

Определение выигрышного номера Шанса происходит путем его формирования поразрядно слева направо из номеров шаров, последовательно извлекаемых из барабана.

Для определения цифры первого слева разряда выигрышного порядкового номера Шанса в барабан помещаются шары с номерами от «0» до цифры, соответствующей первой слева цифре последнего порядкового номера Шанса из Списка. Из барабана извлекается один шар. Номер извлеченного шара вносится в протокол и записывается в первый слева разряд формируемого выигрышного номера Шанса.

Далее, для определения цифры в следующем разряде формируемого выигрышного номера Шанса, в барабан загружаются шары с номерами, которые существуют в соответствующем разряде номеров Шансов в Списке. Шары перемешиваются, и из барабана извлекается один шар. Номер шара вносится в протокол и записывается в соответствующий разряд формируемого выигрышного номера Шанса.

Определение 2 (двух) альтернативных выигрышных номеров Шансов (Альтернативного победителя № 1 и Альтернативного победителя № 2) происходит следующим образом: Альтернативным победителем № 1 становится Участник Игры с номером Шанса через 6000 номеров от победившего номера Шанса, Альтернативным победителем № 2 становится Участник Игры с номером Шанса через 12000 номеров от победившего номера Шанса.

В случае если выпавший номер Шанса находится в конце Списка, то исчисление для определения Альтернативных победителей продолжается с начала Списка.

8.2.3. При проведении розыгрыша Комиссией оформляется протокол розыгрыша.

8.2.4. Участники Игры вправе присутствовать при проведении розыгрыша.

9. Срок и способ информирования победителя, место, порядок и срок выдачи выигрыша

9.1. После проведения розыгрыша Организатор уведомляет победителя о выигрыше по электронной почте, телефону и SMS не позднее 13 октября 2020 г. включительно.

9.2. Для получения Приза победителю необходимо в срок не позднее 15 октября 2020 г. включительно предоставить Организатору по электронной почте: igra@salmongraphics.by следующие данные:

9.2.1. для граждан Республики Беларусь, а также иностранных граждан и лиц без гражданства, имеющих вид на жительство на территории Республики Беларусь:

- копию страницы 25, страниц 31–33 паспорта – для граждан Республики Беларусь;

- копию страницы 3, страниц 15–17 вида на жительство – для лиц, имеющих вид на жительство на территории Республики Беларусь;

9.2.2. для иностранных граждан и лиц без гражданства, не имеющих вида на жительство:

- копию паспорта страны, гражданином которой он является (для лиц без гражданства – документ, подтверждающий их личность, выданный в порядке законодательства страны фактического проживания). В случае если данный документ выдан не на государственном языке Республики Беларусь, также заверенный нотариально перевод такого документа на государственный язык Республики Беларусь.

9.3. Вручение Приза производится по адресу: Республика Беларусь, Минск, пр. Победителей, 143, в срок не позднее 21 октября 2020 г. включительно. Победитель предварительно согласовывает дату и время прибытия за получением Приза с Организатором по телефону +375 17 216-80-77.

9.4. В случае если в установленные данными Правилами сроки не удается связаться с Победителем любым из указанных выше способов, либо Победитель не предоставит данные, необходимые для получения Приза, либо предоставленные данные не соответствуют данным, указанным в анкете Участника программы лояльности клиентов – физических лиц ПО «Белоруснефть», заполняемой при регистрации Карты «Заправка», либо Победитель отказывается от Приза, либо Победитель не явился за получением Приза, либо принято решение об отказе в выдаче приза Победителю в связи с нарушением правил Игры, право на приз переходит Альтернативному победителю № 1.

9.5. Альтернативный Победитель № 1 уведомляется о выигрыше по электронной почте, телефону и SMS не позднее 22 октября 2020 г. включительно. Для получения приза альтернативный Победитель, которому перешло право на получение приза, должен не позднее 26 октября 2020 г. включительно предоставить Организатору по электронной почте: igra@salmongraphics.by данные, указанные в п. 9.2. правил, а также согласовать дату и время получения приза. Вручение приза производится по адресу: Республика Беларусь, Минск, пр. Победителей, 143, в срок не позднее 28 октября 2020 г. включительно.

9.6. В случае если в установленные данными правилами сроки не удается связаться с Альтернативным победителем № 1 любым из указанных выше способов, либо Альтернативный Победитель № 1 не предоставит данные, необходимые для получения приза, либо предоставленные данные не соответствуют данным, указанным в анкете участника программы лояльности клиентов – физических лиц ПО «Белоруснефть», заполняемой при регистрации Карты «Заправка», либо Альтернативный Победитель № 1 отказывается от приза, либо Альтернативный Победитель № 1 не явился за получением приза, либо принято решение об отказе в выдаче приза Альтернативному победителю № 1 в связи с нарушением правил Игры, право на приз переходит Альтернативному победителю № 2.

9.7. Альтернативный Победитель № 2 уведомляется о выигрыше по электронной почте, телефону и SMS не позднее 29 октября 2020 г. включительно. Для получения приза Альтернативный Победитель № 2, которому перешло право на получение приза, должен не позднее 02 ноября 2020 г. включительно предоставить Организатору по электронной почте igra@salmongraphics.by данные, указанные в п. 9.2. правил, а также согласовать дату и время получения приза. Вручение приза производится по адресу: Республика Беларусь, Минск, пр. Победителей, 143 в срок не позднее 05 ноября 2020 г. включительно.

9.8. Альтернативный Победитель № 2 утрачивает право на получение Приза, если с ним не удается связаться любым из указанных выше способов, либо Альтернативный победитель № 2 не предоставит данные, необходимые для получения Приза, либо предоставленные данные не соответствуют данным, указанным в анкете участника программы лояльности клиентов – физических лиц ПО «Белоруснефть», заполняемой при регистрации Карты «Заправка», либо Альтернативный победитель № 2 отказывается от приза, либо Альтернативный победитель № 2 не явился за получением приза, либо принято решение об отказе в выдаче ему приза в связи с нарушением правил Игры.

9.9. В случае если Победитель (Альтернативный победитель № 1 или № 2) не может приехать за получением Приза лично, Приз может получить его доверенное лицо по предъявлении копии паспорта либо вида на жительство Победителя (Альтернативный победитель № 1 или № 2), своего паспорта либо вида на жительство и нотариально заверенной либо приравненной к таковой доверенности от Победителя (Альтернативного победителя № 1 или № 2).

9.10. С момента передачи приза к Победителю (соответственно Альтернативному победителю № 1 или № 2) переходят все риски и обязательства, связанные с владением, пользованием и распоряжением Призом. Денежная компенсация стоимости призов не производится. Победитель, (соответственно – Альтернативный победитель № 1 или № 2) (в случае их нежелания получить приз) не вправе передать право на получение приза другому лицу. Приз не подлежит замене.

9.11. В соответствии с законодательством Республики Беларусь при выдаче призов Организатор удерживает и перечисляет в бюджет подоходный налог в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь, из суммы денежных средств соответствующего приза. Вручение Призов осуществляется за минусом удержанной суммы подоходного налога из денежной части приза.

9.12. Организатор не оплачивает победителю (соответственно Альтернативному победителю № 1 или № 2) расходы, связанные с проездом к месту получения приза.

10. Порядок информирования об условиях и результатах Игры

10.1. Факт участия в Игре означает, что Участники Игры соглашаются с тем, что их имена, отчества, фамилии, фото-, аудио-, видео- и иные материалы о них могут быть использованы Организатором и Заинтересованным лицом в любых рекламных и (или) информационных материалах, связанных с проведением Игры, без уплаты какого-либо вознаграждения Участникам. Победитель Игры дает свое согласие на интервью в средствах массовой информации и съемку для рекламных материалов, подготовленных в связи с проведением данной Игры, без выплаты ему какого-либо вознаграждения. Все права на такие рекламные материалы принадлежат Организатору, Заинтересованному лицу.

10.2. Участник Игры, претендующий на получение Приза, обязуется заполнить и подписать все необходимые документы, предоставляемые Организатором Игры для получения Приза.

10.3. Участие в Игре предполагает ознакомление и полное согласие Участников Игры с настоящими Правилами.

10.4. Правила проведения Игры вместе с реквизитами государственной регистрации публикуются до начала Игры в газете «Звязда». Информация о результатах розыгрыша публикуется не позднее 03 ноября 2020 г. включительно в газете «Звязда».

10.5. Телефон для справок по вопросам проведения Игры (МТС – 033, А1 – 029, Life – 025): 6 431 431 – круглосуточно без выходных.

Свидетельство № 3839 о государственной регистрации рекламной игры, зарегистрированной 20 августа 2020 г., выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

ІСЦІНА НЕ Ў ВІНЕ!

Як своечасова распазнаць алкагалізм і чым дапамагчы блізкаму, які співаецца? Ці існуюць бяспечныя дозы алкаголю? Чаму падчас лячэння бываюць зрывы і як не апусціць рукі ў такім выпадку? Вопыт якіх краін у барацьбе з п'янствам можа быць для нас карысны? Пра гэта і іншае мы пагаварылі з намеснікам галоўнага ўрача па амбулаторным раздзеле работы Мінскага гарадскога клінічнага наркалагічнага дыспансера Жаннай ІСТОМІНАЙ.

БЯСПЕЧНЫХ ДОЗ НЕ ІСНУЕ

— Жанна Вячаслававўна, чаму людзі ўжываюць алкаголь і злоўжываюць ім?

— Пачну з таго, што ўсходнім славянам гістарычна гэта было не ўласціва. Алкаголь прыйшоў да нас з той часткі свету, дзе вельмі спякотна, шмат вінаграду і мала вады. Са старажытнасці людзі заўважылі, што той жа вінаградны сок, які забродзіў, можна выкарыстоўваць як дэзынфікуючы сродак. У спёку прадукты хутка псуюцца, таму падчас яды ўжывалі алкаголь, каб пазбегнуць атручванняў.

Увогуле слова «алкаголь» арабскага паходжання і перакладаецца як «забіраючы розум», «адурманьваючы». На нашы славянскія тэрыторыі алкаголь прыйшоў не так даўно, прычым навязваўся штучным чынам. У часы Расійскай імперыі фармуляры, падпісаныя дзяржаўнымі чынамі, прадпісвалі людзям ужываць алкаголь. У кожнай мясцовасці былі адчынены корчмы, і людзей абавязвалі траціць там пэўныя сумы. З тых, хто не прыходзіў, усё роўна спаганялі гэтыя грошы: п'еш — не п'еш, не важна, грошы павінен аддаць. Алкагольная прамысловасць у той час выдзяляла вялікія сродкі на развіццё чыгункі і іншыя патрэбы за права продажу алкаголю. А паколькі людзі яго не набывалі, іх даводзілася прымушаць. У 1858 годзе нават пачаліся антыалкагольныя бунты, падчас якіх людзі нападалі на шынкі і корчмы і вылівалі алкаголь. Вядома, што за два гады гэтых бунтаў 11 тысяч чалавек было адпраўлена на катаргу. Але алкаголь усё ж такі прыжыўся на нашых тэрыторыях.

Шэраг прычын падштурхоўваюць людзей на ўжыванне спіртнога. Расслабіцца пасля цяжкага працоўнага дня ці для задавальнення, калі добра папрацаваў. Усё дрэнна — таксама нагода. Бяда ці радасць — у нас усё гэта прынята суправаджаць алкаголем — выпіць за здароўе маладых, нованароджанага, праводзіць памерлага. Але памылкова гэта лічаць нашымі старадаўнімі звычаямі. Сярод розных прафесійных груп ёсць быццам бы свае карпарацыйныя традыцыі, але ўсё гэта штучна прыдуманае. Ёсць нават вершык: «Ад даты да даты хаджу непаддаты. А нагоду можна знайсці кожны дзень». Выхадны — выпіў, любімая каманда выйграла — выпіў, прайграла — таксама.

— Колькі часу патрэбна, каб сфарміравалася залежнасць? Калі злоўжыванне пачынае адлюстроўвацца на знешнасці?

— Не заўсёды па чалавеку бачна, што ён злоўжывае спіртным. Калі бачна, гэта ўжо сур'ёзная стадыя захворвання. За які час сфарміруецца залежнасць, складана адназначна сказаць, гэта вельмі індывідуальна. Тут мае значэнне і генетычны фактар, і сацыяльны, і нават мужчына гэта ці жанчына. Важны і біялагічны фактар. У нас ёсць фермент — алкагольдэгідрагеназа. І ад таго, як ён спраўляецца з разбурэннем алкаголю, як хутка наступае абсцінентны (пахмельны) сіндром, залежыць развіццё алкагольнай залежнасці. Хтосьці співаецца за год, хтосьці ўсё жыццё ўжывае нейкую колькасць алкаголю і не мае такіх наступстваў.

— Ці існуе бяспечная доза алкаголю?

— Для людзей усходнеславянскага тыпу бяспечная доза алкаголю роўная нулю. Гэта зноў-такі звязана з наяўнасцю ферменту алкагольдэгідрагеназа. Мне часта супярэчаць, што італьянцы ці грузіны п'юць сталовае віно кожны дзень і не співаюцца. Аднак у паўднёвых нацый іншая генетыка. Паўночныя народы співаюцца вельмі хутка, бо ў іх увогуле няма алкагольдэгідрагеназы. У нас гэтага ферменту мала. Таму нам алкаголь лепш не ўжываць.

Калі чалавек усё ж выпівае, то павінен прытрымлівацца пэўных межаў. Ёсць найменш небяспечныя дозы алкаголю. Яны таксама нанясуць шкоду арганізму, але калі не ўжываць спіртное сістэматычна і не перавышаць гэту дозу, то арганізм адновіцца. За вечар жанчына можа выпіць не больш адной стандартнай дозы (так званы дрынк), гэта 10 грамаў чыстага спірту, або 25 мл гарэлкі, ці 125 мл сухога віна, калі яно мацаванае — 50 мл. Для мужчын гэта два дрынкі — 50 мл моцнага алкаголю. Пры гэтым абавязковая ўмова — два цвярозыя дні на тыдзень. Ні ў якім разе нельга разумець гэта як заклік піць кожны дзень, акрамя двух.

НЕБЯСПЕЧНЫЯ СІМПТОМЫ: ШТОДЗЁННЫ ПРЫЁМ, НАРАСТАННЕ ДОЗЫ

— Як блізкім вызначыць, што чалавек падышоў да небяспечнай мяжы і трэба дзейнічаць?

— У першую чаргу гэта страта колькаснага кантролю — калі ён сеў піць, то напіваецца да бяспамяцтва. Тут трэба біць трывогу і пачынаць размову аб тым, што вас непакоіць празмернае ўжыванне алкаголю. Акрамя таго, ёсць яшчэ шэраг прыкмет: пачынаецца штодзённы прыём, нарастанне дозы, чалавек пастаянна шукае нагоду выпіць.

— Што павінны рабіць блізкія? Як дапамагчы, а не нашкодзіць?

— Блізкія павінны размаўляць, прычым не ў форме скандалаў. Так устроены чалавек, што чым больш яму забараняць, тым больш ён парушае. Размаўляць варта з клопатам пра здароўе — яго і навакольных. «Ты ўчора дазволіў сабе лішняе, сёння адчуваеш сябе дрэнна», «Ты ўпаў і зламаў руку», «У цябе забралі «правы». Сацыяльныя наступствы ці медыцынскія з'яўляюцца, і на гэта трэба мякка ўказваць. Прапаноўваць пайсці па дапамогу да спецыялістаў.

Сёння ў нашым дыспансеры, ды і ва ўсёй краіне ёсць ананімны прыём на платнай аснове. Можна не называць нават сваё прозвішча, акрамя тых выпадкаў, калі неабходна выпіска прэпаратаў-псіхатропаў. Часам словы блізкіх успрымаюцца, як прадузятасць, маўляў, маці на мяне нагаворвае, я п'ю, як усе — па святах. Тут таксама лепш паразмаўляць з урачом. Часам толькі спецыяліст дапаможа разабрацца, што ў чалавека ёсць праблема. Катэгарычных заяў «Ты алкаголік» рабіць таксама не трэба, пра гэта можа сказаць толькі ўрач. Лепш угаварыць пайсці на размову са спецыялістам, прычым разам.

— Калі чалавек пасля лячэння нейкі час трымаецца, потым зрываецца і зноў пачынае піць, і так па коле цягам некалькіх гадоў, што ў такім выпадку рабіць? Ці варта лячыць такога чалавека? Ці можна яго вылечыць?

— Пра вылечыць размова, хутчэй за ўсё, не ідзе. Алкагалізм — гэта хранічнае захворванне, і як ва ўсіх хранічных хвароб, тут ёсць перыяд абвастрэння і перыяд рэмісіі. І гэты чарговы зрыў — перыяд абвастрэння. Сёння многія нарколагі сыходзяцца на тым, што гэта нармальна. Не трэба апускаць рукі, а варта змагацца за чалавека далей. І самому пацыенту, які лечыцца, зноў трэба ісці да доктара і пачынаць усё занава. Алкагалізм — хвароба, калі пакутуе душа і цела. Цела аднавіць лягчэй, а вось душу даводзіцца лячыць гадамі. Гэта работа псіхолагаў, псіхатэрапеўтаў, псіхіятраў. Дакапацца да прычыны, што штурхае чалавека на чарговы запой, чаго яму не хапае, заўсёды няпроста. Ужыванне алкаголю — гэта сыход ад рэчаіснасці. Высветліць, чаму чалавек сыходзіць — гэта работа не аднаго месяца і нават года. Таму варта ўсведамляць, што лячэнне — гэта не толькі пракапацца і закадзіравацца. Гэта работа з псіхолагамі, псіхатэрапеўтамі, наведванне групы ананімных алкаголікаў, у тым ліку наведванне блізкімі груп для сузалежных. Там вучаць правільным паводзінам, каб не было заганнага круга, бо часам і блізкія ўцягнутыя ў гэту залежнасць, і сваімі паводзінамі, як гэта ні сумна, падштурхоўваюць на ўжыванне і чарговы запой.

ЯК ЗМАГАЦЦА З СУХІМ ЗАПОЕМ

— Калі чалавек сыходзіць у запой раз у месяц-два на некалькі дзён, потым самастойна выходзіць і не п'е нейкі час, гэта таксама алкагалізм?

— Так. І як правіла, чалавек прадчувае наступленне гэтага перыяду. І ў такім выпадку ён сам павінен шукаць дапамогі. Блізкія, якія жывуць побач, могуць гэта таксама бачыць і адчуваць па нейкіх прыкметах. І таксама могуць прывесці да ўрача.

Перш чым такі чалавек пачынае піць, у яго з'яўляецца псіхалагічны настрой. Яму можа сніцца, што ён ужывае алкаголь — гэта так званае сухое п'янства. Ён пачынае ўспамінаць, мадэляваць працэс, свае адчуванні, і толькі потым, калі своечасова не прыйшоў да ўрача, зрываецца.

— З дапамогай урача з сухім запоем можна справіцца?

— Так, яго можна перарваць — і псіхатэрапіяй, і прызначэннем падтрымліваючых прэпаратаў. На жаль, не заўсёды нашы пацыенты да гэтага гатовы, хоць з'яўляецца ўсё больш людзей, якія прыходзяць своечасова. Мы папярэджваем, што такое можа быць, і тыя, хто хоча пазбавіцца ад праблемы, кантралюе сябе, прыходзяць да ўрача загадзя. Безумоўна, тут патрэбна вялікая сіла волі і праца над сабой. Дапамагае ў такім выпадку нават наведванне груп ананімных алкаголікаў.

— Здаецца, што наша моладзь усё больш аддае перавагу здаровому спосабу жыцця. Ці ёсць падлеткі з дыягназам алкагалізм?

— У Мінску, напрыклад, усяго адзін падлетак з сіндромам залежнасці. Сапраўды сярод моладзі ёсць трэнд на здаровы спосаб жыцця, на жаль, гэта толькі чамусьці не датычыцца электронных цыгарэт. Але падлеткавы ўзрост — час проб і эксперыментаў, калі яны лічаць, што могуць паспрабаваць цыгарэты і алкаголь. І калі за гэтым заняткам трапляюць у поле зроку настаўнікаў і міліцыі, то накіроўваюцца да нас — на размовы і прафілактычную работу. Са шкоднымі наступствамі ад алкаголю у нас на дыспансерным назіранні знаходзіцца 1058 падлеткаў, якія ўжывалі спіртное і трапілі ў поле зроку педагогаў і міліцыі. Год ад году мы канстатуем зніжэнне гэтых лічбаў. Гэтак жа і колькасць дарослых на дыспансерным уліку зніжаецца. Таму можна меркаваць, што наша нацыя выбірае здаровы спосаб жыцця. І мы пачалі набываць пэўную культуру піцця.

— Якія цяпер метады лячэння ад алкагалізму эфектыўныя і папулярныя?

— Часта лячэнне ананімнае, і ў нас шмат прыватных медцэнтраў, якія аказваюць такія паслугі. Таму вылучыць пэўны метад складана. І «падшыўка», і «кадзіраванне» карыстаюцца папулярнасцю. Больш надзейнай у насельніцтва лічыцца «падшыўка»: калі ўвялі лекі, то здаецца, што гэта больш эфектыўна, чым работа псіхатэрапеўта. Ёсць яшчэ такое памылковае меркаванне, што кадзіроўка ўздзейнічае на мозг, чалавек робіцца не зусім адэкватны. На самай справе псіхалагічная кадзіроўка не ўплывае на разумовыя і характаралагічныя асаблівасці чалавека. Хутчэй за ўсё яны былі і раней, проста іх спісвалі на тое, што чалавек п'яны. Або сапраўды адбыліся змены характару пад уздзеяннем алкаголю.

Усё больш запатрабаваныя апошнім часам рэабілітацыйныя праграмы. У нас іх на сёння тры. «Вясёлка» — на ананімнай платнай аснове, але больш папулярная яна ў наркаспажыўцоў. І яшчэ дзве бясплатныя рэабілітацыйныя праграмы. Пацыенты, якія стаяць на ўліку, пасля аднаўлення цела — дэтоксу — лечаць душу. У стацыянары яны праводзяць 28 дзён.

— Ці будуць мець вынікі абмежавальныя меры ў нашым грамадстве? Ці трэба рэгуляваць колькасць магазінаў, якія прадаюць алкаголь, павялічваць яго кошт, каб зрабіць менш даступным?

— Забароны продажу алкаголю па часе не вельмі эфектыўныя. У нашых людзей у адказ узнікае жаданне купіць пра запас, а калі купілі, значыць, трэба ўсё выпіць. Забароны звычайна прыводзяць да зваротнага эфекту. Павінна быць правільная цэнавая палітыка і скарачэнне пунктаў продажу моцнага алкаголю.

Для нас можа быць карысны вопыт краін, блізкіх нам па менталітэце. Гэта Скандынаўскія краіны, а таксама Польшча. У Скандынаўскіх краінах, напрыклад, у Швецыі, моцны алкаголь прадаецца толькі ў алкамаркетах, якія размяшчаюцца за горадам. Прычым каштуе ён нятанна. У горадзе можна купіць толькі алкагольныя напоі з нізкім утрыманнем спірту — да 3,5 градуса. Я згодна з тым, што моцны алкаголь павінен каштаваць дорага.

Штогод Сусветная арганізацыя аховы здароўя ўстанаўлівае рэйтынг краін па ўжыванні алкаголю. У ім улічваецца насельніцтва ад 15 гадоў і старэйшае, збіраюцца даныя аб продажах, падлічваецца завозны, нелегальны алкаголь, які прысутнічае ў любой краіне. У 2014 годзе мы лідзіравалі ў гэтым рэйтынгу — на душу насельніцтва прыпадала больш за 17 літраў чыстага спірту. Праўда, у той год наша краіна прымала чэмпіянат свету па хакеі, а значыць мела месца прывознае ўжыванне — было шмат турыстаў, продажы павялічыліся. Польшча тады ў рэйтынгу таксама была ў дзясятцы. Яны пайшлі шляхам павышэння акцызаў на моцны алкаголь і змяншэння на слабы. У гэтым ёсць сэнс і з пункту погляду медыцыны: у рэанімацыю і таксікалагічныя аддзяленні трапляюць людзі, якія ўжываюць моцны алкаголь. У Польшчы зменшылася як колькасць атручванняў алкагольнымі напоямі, так і колькасць ужывання.

Мы таксама выйшлі з дзясяткі лідараў гэтага рэйтынга. Але ўсё роўна маем больш за 11 літраў на душу насельніцтва. Сусветная арганізацыя аховы здароўя лічыць, што калі ўжыванне на душу насельніцтва перавышае восем літраў, то ідзе выміранне нацыі. Таму пакуль мы ўсё роўна пад пагрозай.

Алена КРАВЕЦ.

Дызайнер інтэр'ераў Святлана ПУХОЎСКАЯ:

«Любімага колеру ў мяне няма»

Шмат каму, напэўна, знаёма пачуццё разгубленасці, калі заязджаеш у новую, яшчэ неабжытую кватэру з нязвыклым пейзажам за вокнамі і незнаёмым размяшчэннем дзвярэй. Або робіш капітальны рамонт — уся мэбля вынесена, пустая і гулкая прастора здаецца чужой, і раптам становіцца незразумела, што з ёю рабіць далей. Ці, нарэшце, увасобіў даўнюю мару, пабудаваў уласны дом — і ў яго пустых пакоях замест радасці адчуваеце няўпэўненасць. Менавіта ў такіх выпадках (калі сродкі дазваляюць) варта звярнуцца да нашай суразмоўніцы. З дызайнерам інтэр'ераў Святланай Пухоўскай мы размаўляем пра апошнія трэнды ў арганізацыі жылой прасторы і пра тое, як упісаць вобразы з глянцавых часопісаў у паўсядзённае жыццё.

Аб прыгажосці, сумленні мастака і прозе жыцця

— Дызайнер — гэта мастак. Але ж ёсць і іншы бок — заказчык. Напэўна, жыць у рэалізаванай мары іншага чалавека, хай нават і прафесіянала, гатовы далёка не кожны?

— Правіла «кліент заўсёды мае рацыю» ніхто не адмяняў. Галоўная задача дызайнера — зрабіць так, каб чалавеку, які будзе жыць у гэтым доме ці кватэры, было камфортна. Можна стварыць вельмі стыльны інтэр'ер, дзе канапа павінна стаяць толькі ў адным мажлівым пункце, таму што гэта каляровы акцэнт, які знаходзіць водгук з вазай таго ж колеру на далёкай кухні, — і рухаць канапу, як і прыбіраць са стала вазу, ні ў якім выпадку нельга, інакш акцэнт водгуку не знойдзе. Але ці зможа ў такім інтэр'еры жыць заказчык? Гэта будзе не жылое памяшканне, а шоўрум дызайнера. А заказчык з часам пачне ўсё перарабляць сам — і вось тады будзе кашмар. Сваю задачу я бачу ў тым, каб чалавек застаўся задаволены, і пры гэтым каб маё сумленне мастака было чыстае, таму што атрымалася сапраўды прыгожа. На першым этапе працую як псіхолаг: уважліва слухаю і спрабую зразумець, што ж на самай справе трэба чалавеку, які да мяне звярнуўся. Ведаеце, калі мне задаюць пытанне: «Які твой любімы колер?» — я не магу на яго адказаць. У мяне няма любімага колеру. Гэта ў маіх кліентаў ёсць перавагі ў каляровай гаме — напрыклад, неперанаснасць цёмнага. У мяне была заказчыца, прафесар медыцыны, якая працуе ў сферы анкалогіі. Яна ў катэгарычнай форме адмовілася ад любых цёмных адценняў у сваім доме: «Не ўяўляю, як можна жыць у цёмным пакоі!» А наогул я стараюся не вяртацца ў свае інтэр'еры, таму што ад гэтага адчуваю разгубленасць. Неяк мне трэба было сфатаграфаваць праект праз некалькі месяцаў пасля яго завяршэння. Зайшла ў дом — і мне стала сумна. Канапы засланыя нейкімі пакрывальцамі савецкага ўзору, сталы заваленыя, падаконнікі застаўленыя. Гаспадары кажуць: «Здымайце, калі ласка». А фатаграфаваць ужо няма чаго. Атрымалася знайсці толькі адзін некрануты куток, дзе яшчэ засталася прыгажосць. Напэўна, гэта няправільна — так дбайна ставіцца да выніку сваёй працы...

— Хто вашы заказчыкі?

— Часцей за ўсё гэта досыць маладыя людзі. Узроставы дыяпазон — ад 25 да 45-50 гадоў. Зразумела, што гэта людзі дастаткова забяспечаныя. Часам у дызайн кватэры ці дома трэба ўкласці яшчэ адзін кошт гэтай кватэры або дома. Але, зразумела, усё залежыць ад пажаданняў: гэта можа быць і танней.

— Святлана, прабачце за гэтае пытанне, але ці сапраўды дызайн жылога памяшкання настолькі неабходны? Шмат каму дастаткова проста даху над галавой і самых простых прадметаў мэблі, а ці спалучаюцца яны паміж сабой — магчыма, не вельмі важна...

— Ведаеце, па маіх назіраннях прыгажосць сапраўды ратуе. Гэта не фразеалагізм, гэта факт. Чалавек падаўжае сабе жыццё, калі знаходзіцца ў прыгажосці. Ён папраўляе здароўе, становіцца мацнейшы фізічна, лягчэй пераносіць стрэсы. Жывучы ў прыгажосці, чалавек і адпачывае, і аднаўляецца хутчэй. Навакольнае харастно папаўняе сілы, стымулюе нас на нешта новае, робіць лепшымі. Ці лёгка кінуць на падлогу абгортку ад шакаладкі ў музейнай зале, дзе нас акружае прыгажосць? Рука не падымецца. А калі паўсюль валяюцца абгорткі, агрызкі і пустыя пачкі ад цыгарэт, чаму б не кінуць яшчэ адну паперку? Калі дома бардак, шпалеры адклейваюцца і пад вугал канапы падкладзена кніжка, каб канапа не хісталася, вам будзе лянотна не тое што ўборку зрабіць — у вас наогул рукі апусцяцца. А калі дома добры рамонт, яго захочацца падтрымліваць. Зразумела, што сапраўдная прыгажосць схаваная ўнутры, але і знешняя чалавеку неабходна. Прыгожае адзенне, якое мы надзяваем, прыгожыя інтэр'еры, у якіх мы жывём, — усё гэта стымулюе нас на поспех і развіццё.

Аб модзе, густах і няўпэўненасці

— Ці бывае, што погляды заказчыка і дызайнера кардынальна разыходзяцца?

— Часам з кліентамі сапраўды бывае няпроста. Нярэдка, напрыклад, муж і жонка супярэчаць адно аднаму ў сваіх пажаданнях. Бываюць і смешныя выпадкі. Нам прывезлі плітку. На другім баку плітні была стрэлка, якая паказвала напрамак раскладкі, каб малюнак быў правільны. І раптам чую ад заказчыцы: «Плітку кладуць няправільна». Удакладняю, чаму. Яна адказвае: «Стрэлка заўсёды павінна быць накіравана ўверх!» Была ў мяне заказчыца, для якой я зрабіла інтэр'ер у загадзя абгаворанным стылі, а пазней яна вырашыла, што хоча нешта іншае. І паставіла мне некалькі ўмоў, якія спачатку здаліся ўзаемавыключальнымі. Некалькі тыдняў я не магла пачаць працаваць, таму што гэтыя патрабаванні проста не атрымлівалася сумясціць. Але ўрэшце я зрабіла так, як хацела заказчыца, нават разумеючы, што раблю заведама горш, чым было першапачаткова. Я зрабіла гэта, бо не мне, а ёй жыць у гэтым доме, і лічу, што паступіла правільна. Часам даводзіцца чуць: «У нас быў не вельмі прафесійны дызайнер!» А я знаёмая з гэтым чалавекам і добра ведаю, што ён — выдатны спецыяліст. Проста ён не хоча слухаць кліента і не гатовы «наступаць на горла ўласнай песні». А я, выслухаўшы, бяру заказчыка за руку і вяду за сабой да правільнага разумення прыгажосці — без усякага гвалту. У гэтым задача прафесіянала. Магу сказаць, што айчынным дызайнерам у чымсьці пашанцавала: у Беларусі шмат людзей з добрым густам. Але яны не ўпэўненыя ў сабе і сваім густе, ім трэба дапамагчы знайсці ўласнае бачанне прыгажосці і ўвасобіць яго ў інтэр'еры свайго дома.

— А што цяпер у модзе? Дызайн інтэр'ераў падпарадкоўваецца трэндам, або ўплыў моды тут не такі вялікі, як, напрыклад, у дызайне адзення?

— Зразумела, мода ў дызайне інтэр'ераў прысутнічае. Бо дызайн і мода — наогул звязаныя паміж сабой паняцці. Але мода ў дызайне інтэр'ераў (асабліва калі гаворка ідзе пра жылыя памяшканні) не настолькі мабільная і пераменлівая, як, напрыклад, у дызайне адзення. У сярэднім яна змяняецца раз у дзесяцігоддзе, а глабальна — раз у стагоддзе. Цяпер у модзе экалагічнасць: шмат святла, практычнасць і адсутнасць «празмернасцяў». Гэта ў першую чаргу так званы скандынаўскі стыль — белы інтэр'ер з яркімі каляровымі акцэнтамі. Імі могуць быць падушкі, арт-аб'екты, рамачкі на сценах. Іншымі словамі, практычны і зручны інтэр'ер застаецца ў трэндзе ўжо досыць шмат гадоў. Ён аптымальны для жыцця. Калі сродкі дазваляюць, можна спыніцца на класіцы — яна заўсёды актуальная. Але класіка патрабуе досыць багатага аздаблення: натуральнае дрэва і тканіны, мэбля з масіву. І канешне, зараз актуальны стыль ардэко. Ён з'явіўся ў мінулым стагоддзі і афарміўся за тры дзесяцігоддзі паміж дзвюма сусветнымі войнамі. Яго філасофія — жаданне жыць. Ар-дэко стаў пераемнікам мадэрну, але на яго паўплывалі і кубізм Пікаса, і канструктывізм, і эстэтыка ўсходніх інтэр'ераў. Калі ў любым іншым інтэр'еры выкарыстоўваюць адзін-два акцэнты, то ў ар-дэко ўсё — акцэнт. Таму тут так важна захаваць пачуццё меры. На жаль, цалкам стварыць інтэр'ер у стылі ар-дэко атрымоўваецца не часта — гэта досыць дорага для заказчыка. Хоць і ў Мінску я гэта рабіла. Але часцей нашы суайчыннікі аддаюць перавагу больш простым і мінімалістычным стылям. У гэтым мы падобныя з Еўропай. Я працавала ў Германіі — там дарагі дызайн лічыцца дарэчным толькі ў інтэр'ерах рэстаранаў і пяцізоркавых атэляў. Дома нават забяспечаныя людзі абіраюць дэмакратычны і лаканічны скандынаўскі стыль. Быў, праўда, у мяне адзін па-сапраўднаму раскошны праект. У гістарычнай частцы Дрэздэна, з мэбляй ад Рычарда Гая, у маім любімым стылі ар-дэко, дзе кожная дэталь была з разыначкай. Але заказчыкамі былі не этнічныя немцы, а нашы суайчыннікі, якія пераехалі ў Германію і пражылі ў Саксоніі ўжо больш за 20 гадоў.

Скандынаўскі стыль у інтэр'еры.



Арт-дэко.

Класічны стыль у афармленні жылой прасторы.

— А што яшчэ вы можаце сказаць пра густы беларусаў у дызайне інтэр'ераў?

— На жаль, жыхары нашай краіны крышачку закамплексаваныя ў выбары колераў, баяцца яркіх тонаў. Першае, што я, як правіла, чую ад кліента, — «Мне што-небудзь спакойненькае, бэжавае або карычневае». Нават «няяркае блакітнае» — гэта ўжо смела. Радуе, што ад карычнева-бэжавых колераў у інтэр'еры мы паступова адыходзім. З'яўляюцца, напрыклад, адценні шэрых тонаў. Гэты колер мае ў афармленні інтэр'ераў вялікі патэнцыял, ён прадстаўляе дызайнеру надзвычай шырокую палітру адценняў, як цёплых, так і халодных. Паступова кліенты пачынаюць прымаць складаныя колеры ў інтэр'еры: прыглушаныя бэзавы, фісташкавы, ружовы. З'явіўся і чысты блакітны колер — раней яго не хацелі. І нават белы. Яшчэ пяцьшэсць гадоў таму нашы людзі лічылі, што белы — «бальнічны колер». Між тым ён такі ж мнагастайны, як і шэры, чырвоны, карычневы.

Каму гэта па кішэні?

— Як працуе дызайнер інтэр'ераў?

— Прафесіянал можа стварыць дызайн пакоя, узяўшы за адпраўны пункт рамку для фатаграфіі. Дапусцім, кліент любіць вось гэтую рамачку. Я пачынаю думаць, дзе б яна магла вісець або стаяць. Спачатку патрэбны каркас — правільна арганізаваная прастора, а потым на гэты каркас мы «надзяваем» сам інтэр'ер. Вобразна кажучы, «касцюм» можа быць любы — ад дзелавога стылю да кэжуал. Так што вельмі важна першапачаткова правільна арганізаваць прастору. Чалавечае вока заўсёды імкнецца да правільных формаў — да квадрата або кола, у гэтых аб'ёмах чалавек адчувае сябе камфортна. Гэта і называецца «ўтульнасць». Нават прастору няправільнай формы можна зрокава змяніць пры дапамозе афармлення столі або падлогі, люстэркаў або расстаноўкі мэблі — і вось ужо памяшканне здаецца вам утульным. Першае, на што мы падсвядома звяртаем увагу, уваходзячы ў пакой, — гэта яго форма і колер. Які колер выклікае ў вас прыемныя асацыяцыі — залежыць ад вашых індывідуальных схільнасцяў. Але і тут ёсць правілы. Напрыклад, недапушчальныя кіслотныя адценні ў дэкоры сцен. Затое яны могуць быць дарэчныя ў арт-аб'ектах, якія расстаўляюць акцэнты: дызайнерскае крэсла, таршэр, рамкі, вазы.

— Дызайн інтэр'еру — наколькі гэта доўга па часе? І ўсё ж такі: наколькі гэта дорага?

— Зразумела, што работа над інтэр'ерам кватэры, а тым больш дома, — гэта доўга. Праходзіць мінімум шэсць месяцаў з таго моманту, як людзі прыйшлі да мяне ўпершыню, і да дня, калі я запрашаю іх ацаніць вынік маёй працы. Дызайнер стварае інтэр'ер «пад ключ» — выбірае мэблю, рашэнні для асвятлення прасторы, шторы, дэталі і акцэнты. Гэта апошні чалавек, з якім развіваюцца гаспадары, — значна пазней, чым з будаўнікамі і аддзелачнікамі. І часта — першы чалавек, які прыходзіць у іх кватэру, — яшчэ да будаўнікоў. Я раблю будаўнічыя чарцяжы, па якіх яны працуюць. І, зразумела, у мяне ёсць свае будаўнічыя брыгады, з якімі я ўвесь час супрацоўнічаю, як і свае мэбельшчыкі, мноства іншых спецыялістаў. А наконт цаны... у прынцыпе, дызайн інтэр'ера магчымы пры любым бюджэце.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

АНАМАЛЬНАЕ ЛЕТА

Чаму пашыраюцца прыродныя катаклізмы?

Лічаныя дні засталіся да заканчэння лета. Яно насамрэч атрымалася анамальнае. Лета-2020 устанавіла неверагодныя тэмпературныя рэкорды, што абяцае планеце разбуральны сезон ураганаў, пажары, засуху і паводкі. Адны краіны млеюць ад спёкі, другія мокнуць і мерзнуць. Як адзначае «Бі-бі-сі», навукоўцы перакананы, што ўсё гэта — чарговае пацвярджэнне змены клімату, і прадказваюць 2020-му месца ў пяцёрцы самых гарачых гадоў за паўтара стагоддзя назіранняў. Чаму пашыраюцца прыродныя катаклізмы, што нас чакае ў далейшым?

ЛЁДУ МЕНШ, УРАГАНАЎ БОЛЬШ

Такія рэкорды становяцца дрэнна традыцыяй: 19 з апошніх 20 гадоў уваходзяць у дваццатку самых гарачых, а апошнія шэсць гадоў займаюць першыя шэсць радкоў у гэтым рэйтынгу. Праз некалькі месяцаў іх будзе сем з сямі, калі ўсё будзе ісці так, як ідзе. У гэтым выпадку здагадкі аб тым, што глабальнае пацяпленне паскараецца, атрымаюць новае пацвярджэнне. А значыць, планы прадухілення кліматычнай катастрофы, узгодненыя амаль усімі краінамі свету і замацаваныя ў Парыжскім пагадненні, давядзецца пераглядаць. Аднак час для гэтага як ніколі нязручны: пандэмія каранавіруса апускае свет у цяжкі эканамічны крызіс, і затратны «зялёны» парадак дня ў многіх краінах адыходзіць на другі план.

Ліпень 2020-га стаў адным з трох найгарачэйшых з 1880 года: тэмпература паверхні сушы і акіянаў аказалася вышэйшай за сярэднюю для XX стагоддзя на 0,92 °C, не дацягнуўшы ўсяго 0,01 градуса да абсалютнага рэкорду леташняга ліпеня. І тое гэта адбылося выключна дзякуючы крыху халаднейшай, чым звычайна, зіме ў паўднёвым паўшар'і. Дзевяць з дзесяці рэкордна гарачых ліпеняў прыпалі на апошняе дзесяцігоддзе. Шэсць — на апошнія шэсць гадоў.

«Гэта не тыя рэкорды, да якіх варта імкнуцца, — заўважыла «Бі-бі-сі» Гарэт Рэдманд Кінг з Сусветнага фонду дзікай прыроды (WWF). — Трапічная спякота, можа, часам і прыемная жыхарам краін накшталт Вялікабрытаніі, але насамрэч яна — яркі напамін пра кліматычны крызіс на планеце».

Экстрэмальная гарачыня непрыемная па многіх прычынах. Па-першае, яна смяротная. Паводле звестак каралеўскай метэаслужбы Брытаніі, апошнія некалькі гадоў спякота забівае больш людзей, чым любыя іншыя прыродныя катаклізмы. Ад павышэння тэмпературы высыхае глеба, а льды растаюць. У мінулым месяцы арктычнае ледзяное покрыва было на чвэрць меншае за сярэдні паказчык апошніх 40 гадоў і самае нязначнае за ўвесь час назіранняў. Паўночны марскі шлях быў практычна цалкам вольны ад лёду. Як адзначае «Бі-бі-сі», раней у Арктыцы растаў кавалак лёду памерам з Польшчу. А за апошнія 45 гадоў аб'ём абледзянення паменшыўся на дзве траціны, і такімі тэмпамі да сярэдзіны стагоддзя марскога лёду на Поўначы не застанецца зусім. Як адзначыў генеральны сакратар Сусветнай метэаралагічнай арганізацыі (СМА) Петэры Таалас, «тое, што адбываецца ў Арктыцы, не застаецца ў Арктыцы. З-за ўзаемасувязяў палюсы ўплываюць на кліматычныя ўмовы ў ніжэйшых шыротах, дзе жывуць сотні мільёнаў людзей».

Пакуль каля полюса наступствы экстрэмальнага пацяплення «ўшчыльняюць» белых мядзведзяў і маржоў, бліжэй да экватара яны ўскладняюць жыццё мараходам і жыхарам прыбярэжных тэрыторый. Сёлета сезон ураганаў пачаўся незвычайна рана, і ўжо да ліпеня па тропіках прайшлося цэлых дзевяць імянных штармоў — рэкордны паказчык для сярэдзіны лета.

Моцныя вятры каля экватара могуць сведчыць пра зараджэнне феномена Ла-Ніння — паніжэнне тэмператур у Ціхім акіяне, што разам з нагрэтай Атлантыкай абяцае ўдарны сезон ураганаў-2020. Нацыянальнае ўпраўленне акіянічных і атмасферных даследаванняў ЗША (NOAA) прадказвае 19—25 магутных цыклонаў замест звычайных 12 і чакае, што 7—11 з іх узмоцняцца да ўраганаў, а 3—6 акажуцца ў найвышэйшай ступені разбуральнымі.

ПАМІЖ ЗАСУХАЙ І ПАВОДКАЙ

Калі адна палова Еўропы ў ліпені знемагала ад спякоты і забараняла паліваць сады са шлангаў, то другая хуталася ў пледы і адпампоўвала ваду з затопленых агародаў. У Фінляндыі ліло ў два з паловай разы больш за норму і было халаднейшае, чым звычайна, на 1-2 градусы,

тады як Партугалія перажыла самы гарачы ліпень за ўсе 90 гадоў назіранняў, а Францыя — з 1959-га. Пра гэта са спасылкай на звесткі еўрапейскага цэнтра Copernicus Climate Change Service (C3S) паведаміла «Бі-бі-сі».

Менавіта такімі «ўзгоркамі» і небяспечнае глабальнае пацяпленне, даўно і ў адзін голас папярэджваюць навукоўцы: рэзкімі перападамі тэмпературы і вільготнасці, прыроднымі катаклізмамі і ператварэннем умеранага клімату ў экстрэмальны. Нагнетанне планеты вядзе да збояў ва ўстойлівай сістэме астуджэння і цыркуляцыі вады і паветра, выклікае ўраганы, трапічныя залевы, засуху і маразы, напаўняючы YouTube і «Твітэр» хронікамі апакаліпсіса з серыі «старажылы не ўзгадаюць», заўважыла «Бі-бі-сі».

Адносная вільготнасць паветра на сушы ў цэлым на планеце скарачаецца апошнія 40 гадоў, і прычынай таму не памяншэнне ападкаў, а той факт, што паветра над кантынентамі награваецца ўсё хутчэй і розніца з тэмпературай каля паверхні акіянаў павялічваецца, адзначаюць навукоўцы. Адхіленні ад нормы не толькі пачасціліся, але і сталі больш працяглыя. Еўропа пакутуе вось ужо трэцяе засушлівае лета запар, гэта адбіваецца на ўраджаі і, адпаведна, на эканоміцы.

Двухгадовую засуху Стары Свет перажыў упершыню за чвэрць тысячагоддзя — гэта вынікае з даследавання, апублікаванага ў жніўні. Пры гэтым эксперты ацэньвалі толькі 2018—2019 гады і не ўлічвалі засушлівы 2020-ы. «Імавернасць паўтарэння такога сцэнарыя павялічыцца ў найбліжэйшай будучыні, у асноўным з-за пацяплення, выкліканага дзейнасцю чалавека», — мяркуюць аўтары навуковай работы і папярэджваюць, што калі нічога не рабіць, то ў другой палове стагоддзя шматгадовая засуха будзе «наведваць» Стары Свет у сем разоў часцей, чым цяпер.

У XXI стагоддзі перыяды «абязводжвання» ў Еўропе пачасціліся, і ў 2003-м яна перажыла засуху біблейскага маштабу, якая здараецца раз на некалькі стагоддзяў, пішуць вучоныя. Ацэнкі эканамічнага ўрону пасля такіх катаклізмаў — мільярды еўра. Асноўныя страты — ад памяншэння ўраджаю і згортвання экспарту прадуктаў харчавання.

Вось і сёлета ЕС саступіў першынства на сусветным рынку збожжавых. Вядучы еўрапейскі вытворца — Францыя — у гэтым сезоне скароціць экспарт удвая, і нават добры ўраджай у Польшчы і краінах Балтыі не дазволіць кампенсаваць такі правал і страту долі рынку. Расія ж, наадварот, прадчувае другі найбуйнейшы ўраджай у сучаснай гісторыі і дзякуючы яму верне сабе сусветнае лідарства. Лакальныя рэкорды ўраджайнасці чакаюцца ў Канадзе і Аўстраліі, прыводзіць Bloomberg ацэнкі амерыканскага аграрнага ведамства.

РЭКОРДЫ ДАЛІНЫ СМЕРЦІ

Аналагічная еўрапейскай сітуацыя склалася гэтым летам і па іншы бок Атлантыкі. Паўднёвы захад ЗША выгарае пад пякучым сонцам, а цэнтральныя штаты залівае рэкордныя дажджамі. Самы яскравы прыклад пацяплення і яго наступстваў чарговы раз узялася прадэманстраваць Каліфорнія. Спачатку яна пабіла ўласны тэмпературны рэкорд — плюс 54,4 градуса (!) у Даліне Смерці. Потым ва ўсім штаце ўпершыню за 20 гадоў пачаліся веерныя адключэнні электрычнасці: кандыцыянеры і халадзільнікі перагрузілі сетку.

Губернатар Гэвін Ньюс паставіў адназначны дыягназ: «У Каліфорніі гэта датычыцца кожнага, і ніхто не мае ніякіх ілюзій: усе тут ведаюць, што спякота становіцца ўсё больш гарачая, а засуха — больш засушлівая. Мы даўно ўсвядомілі наступствы змены клімату».

Асобныя месцічы вінаваціць улады ў правальным дзяржрэгуляванні энергасістэмы самага населенага і багатага штата ЗША. Кіраўнік каліфарнійскага аператара рынку электраэнергіі Стывен Берберык не згодны. «Прагноз нагрузкі на электрасеткі адлюстроўвае рэаліі змены клімату. Становіцца ўсё гарачэй», — цытуе яго FT. Пацвярджэнне таму — лясныя пажары. Сярэдняя тэмпература ў Каліфорніі павышаецца хутчэй, чым на планеце ў цэлым, а колькасць ападкаў скарачаецца. У выніку — павелічэнне плошчы згарэлых лясоў на 40 працэнтаў кожнае дзесяцігоддзе.

Не толькі летам, але і ўвесь 2020-ы адзначаліся анамаліі, якія

ўжо становяцца нормай. У студзені—ліпені планета нагрэлася на 1,05 градуса вышэй за сярэднюю лічбу — гэта другі вынік пасля 2016-га, і разрыў мікраскапічны, усяго 0,04 градуса. І Еўропа, і Азія пабілі тэмпературныя рэкорды. Амерыканскія навукоўцы з NOAA прагназуюць, што гэты год увойдзе ў пяцёрку самых гарачых за ўсю 141-гадовую гісторыю назіранняў, і дапускаюць прыкладна 75-працэнтны шанц таго, што ён акажацца рэкордным.

Можа здарыцца і па-іншаму, калі згаданая Ла-Ніння ў Ціхім акіяне набярэ моц. Аднак лакальнае пахаладанне не зламае агульны трэнд, бо ў гэтым выпадку вецер толькі часова згоніць цяпло з паверхні акіяна і панізіць асноўны паказчык метэаралогіі — тэмпературу на паверхні, але не зменіць агульнай колькасці энергіі, якая вызначае клімат на планеце.

ЗАБЫЛІ ПРА АФРЫКУ

Каб утаймаваць пацяпленне, амаль усе краіны свету дамовіліся скараціць выкіды парніковых газаў у атмасферу ў спробе ўтрымаць павышэнне тэмпературы на планеце ў межах паўтара градусаў у параўнанні з даіндустрыяльным узроўнем. Эколагі даўно папярэджваюць, што гэтага недастаткова, асабліва з улікам выхаду ЗША з дамовы.

У гарачым ліпені-2020 навукоўцы прывялі новы аргумент. Яны пералічылі ранейшыя мадэлі і прыйшлі да высновы, што рызыка павышэння тэмпературы пры бягучым узроўні выкідаў вышэйшая, чым меркавалася раней. Таму разлічваць на натуральнае памяншэнне канцэнтрацыі вуглякіслага газу ў атмасферы не выпадае — трэба менш «смуродзіць неба».

У адваротным выпадку спякота будзе толькі нарастаць, прыйшлі да высновы аўтары другой навуковай публікацыі гэтага анамальнага лета — спецыялісты брытанскай каралеўскай метэаслужбы, заснаванай бацькам сучаснай метэаралогіі Робертам Фіцроем (пад яго кіраўніцтвам амаль 200 гадоў таму Чарльз Дарвін хадзіў у экспедыцыю на караблі «Бігль», у выніку чаго нарадзілася тэорыя эвалюцыі відаў). Пасля таго як мінулым летам у Брытаніі быў пабіты тэмпературны рэкорд і слупок тэрмометра ў Кембрыджы дапоўз да 38,7 градуса Цэльсія, яны ўзяліся мадэляваць будучыню і прыйшлі да высновы, што пры захаванні цяперашніх выкідаў у атмасферу 40-градусная спёка ў Брытаніі да 2100-га будзе здарацца кожныя тры з паловай гады замест ранейшых 100-300 гадоў.

Іх калегі з Оксфардскага ўніверсітэта, са свайго боку, прапанавалі даваць эпізодам анамальнай спякоты імёны (як ураганам), бо яны здараюцца ўсё часцей і забіваюць значна больш людзей. А ворага варта ведаць у твар. Да гэтай думкі яны прыйшлі, высветліўшы, што сапраўдны маштаб бедства невядомы, бо далёка не ўсё ўлічваецца. Адно з самых гарачых месцаў планеты — Афрыка — фактычна не прадстаўлена ў базах даных экстрэмальных з'яў надвор'я, на аснове якіх даследчыкі робяць высновы аб хуткасці і наступствах змены клімату.

За апошнія 120 гадоў у базе з'явіліся ўсяго два запісы пра анамальную спякоту ў Афрыцы на поўдзень ад Сахары, тады як у Еўропе такіх выпадкаў было зафіксавана аж 83 за 40 гадоў (яны забралі 140 тысяч жыццяў). І гэта пры тым, што еўрапейцы лічаць анамаліяй больш за тры дні спёкі запар, тады як афрыканцы не бачаць нічога незвычайнага ў тыднёвых эпізодах, а ў 1992 годзе і зусім жылі ў такіх экстрэмальных умовах цэлых чатыры месяцы. У міжнароднай базе даных па бедствах EM-DAT запісаў пра гэтую падзею няма.

У перыяд з 2020 да 2024 года практычна ва ўсіх рэгіёнах планеты будуць назірацца новыя рэкорды тэмператур. Ніводны з кантынентаў не абмінуць змены, кажа французскі вучоны Паскаль Іу. Пры гэтым у самых верхніх шыротах клімат стане больш вільготны, а ў сярэдніх перыяды засухі летам будуць змяняцца ўраганамі зімой. Напрыклад, у Францыі, згодна з рознымі мадэлямі кліматолагаў, у наступныя дзесяцігоддзі тэмпература +40 °C стане звычайнай рэччу, а да канца стагоддзя можна чакаць пікаў ад +45 °C да +50 °C. Некаторыя мадэлі мяркуюць да +55 °C», як расказаў у інтэрв'ю газеце La Voix du Nord навуковец Рабер Ватар. Гучыць фантастычна, а як усё будзе насамрэч — пакажа час.

Захар БУРАК.

Антикризисный управляющий частного туристического унитарного предприятия «Агроэкоотдых» – ООО «Капитал Диалог» (организатор торгов) извещает о проведении 15.09.2020 г. в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Тростенецкая 5, пом. 221 открытых торгов по продаже дебиторской задолженности частного туристического унитарного предприятия «Агроэкоотдых»

КФХ «Лесная усадьба» (размер задолженности – 364 140,00 BYN) – первоначальная цена – 327 726,00 BYN; ООО «Архитектурная студия А. Соболевского» (размер задолженности – 9 234,08 BYN) – первоначальная цена – 8 310,67 BYN; частное предприятие «ВиндорсСервис» (размер задолженности – 25,51 BYN) – первоначальная цена – 22,96 BYN; ИП Якубович Дмитрий Юрьевич (размер задолженности – 366,00 BYN) – первоначальная цена – 329,40 BYN; НПООО «МЕТАЛЛОН-ИНВЕСТ» (размер задолженности – 3 015,94 BYN) – первоначальная цена – 2 714,35 BYN; ООО «Телкомет Системс» (размер задолженности – 98,94 BYN) – первоначальная цена – 89,05 BYN; ЧТУП «Новоселье-Тур» (размер задолженности – 79 233,19 BYN) – первоначальная цена – 71 309,87 BYN; Открытое акционерное общество «Жлобинский карьер формовочных материалов» (размер задолженности – 420,61 BYN) – первоначальная цена – 378,55 BYN; ИП Осинцева Галина Афанасьевна (размер задолженности – 100,00 BYN) – первоначальная цена – 90,00 BYN.

Шаг аукциона – 5 % от цены лота. Задаток для участия в аукционе – 5 % от цены лота. Прием заявлений на участие в торгах осуществляется по почтовому адресу: 220123, г. Минск, а/я 68, с даты настоящей публикации по 14.09.2020 г. Оплата задатка производится с даты настоящей публикации по 14.09.2020 г. вкл. на р/с частного туристического унитарного предприятия «Агроэкоотдых»: BY81BELB30120065180040226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», код BELBBY2X, УНП 690547991.

Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену. Заключение договора купли-продажи осуществляется в течении 10 дней со дня проведения торгов. Победитель торгов в течении 5 банковских дней со дня заключения договора купли-продажи оплачивает цену за минусом внесенного задатка. Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течении 5 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов. Уведомление участников об итогах торгов в день торгов, публично. Возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. Участие в торгах и результаты торгов оформляются итоговым протоколом в день их проведения. В случае признания торгов несостоявшимися в связи с подачей заявления на участие в них только одним участником, предмет торгов может быть реализован этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Организатор может отказаться от проведения торгов не позднее, чем за один день до их проведения.

УВЕДОМЛЕНИЕ

Открытое акционерное общество

«УПРАВЛЕНИЕ МЕХАНИЗАЦИИ № 91»,

юридический и почтовый адрес: 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 7, регистрационный номер 100055130, уведомляет, что 21.08.2020 в Государственном реестре ценных бумаг зарегистрирован дополнительный выпуск простых (обыкновенных) акций ОАО «УПРАВЛЕНИЕ МЕХАНИЗАЦИИ № 91»:

- в количестве 963 480 штук,
- номинальной стоимостью 0,12 рубля,
- на сумму 115 617,60 рубля.

Таким образом, в Государственном реестре ценных бумаг по состоянию на 21.08.2020 за № 5-200-01-6263 зарегистрированы простые (обыкновенные) акции ОАО «УПРАВЛЕНИЕ МЕХАНИЗАЦИИ № 91»

- в количестве 13 736 366 штук,
- номинальной стоимостью 0,12 рубля,
- общая сумма выпуска – 1 648 363,92 рубля.

Одновременно из Государственного реестра ценных бумаг исключен выпуск простых (обыкновенных) акций ОАО «Трест Спецсельстрой» (государственный регистрационный номер выпуска № 5-200-01-11465 от 03.08.2006), реорганизованного путем присоединения к ОАО «УПРАВЛЕНИЕ МЕХАНИЗАЦИИ № 91».

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельоблстрой» (продавец) в лице антикризисного управляющего в деле о банкротстве Колеснёва Н. М. извещает о проведении 14 сентября 2020 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 62 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества без учета НДС (20 %), бел. руб.	Шаг аукциона (5 %), бел. руб.	Сумма задатка без учета НДС (20 %), бел. руб.
	Условие продажи: 1. Претендент на покупку (победитель) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. **2.** Земельный участок под объект продажи **(лоты №№ 2–7)** будет выделен согласно законодательству РБ (предварительная схема пользования земельного участка под объекты продаж прилагается). Возмещение затрат по выделению земельного участка под объект недвижимости возлагается на Покупателя (победителя аукционных торгов). **3.** В соответствии с действующим Законодательством РБ (в части изменения подпункта 2.30 пункта 2 статьи 115 в Налоговом кодексе РБ с 1 января 2019 года) **реализация имущества осуществляется без учета НДС 20 %**			
	Местонахождение лотов №№ 2, 3, 4, 5, 6, 7: Гомельская обл., Буда-Кошелевский р-н, г. Буда-Кошелево, ул. Техническая, 11. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **320550100003000043,** общей площадью **2,5873 га (право постоянного пользования). Целевое назначение земельного участка:** для размещения объектов административно-управленческого назначения. **Условие продажи:** земельный участок под объект продажи будет выделен по заявке нового собственника согласно законодательству РБ (предварительная схема пользования земельного участка под объекты продаж прилагается)			
2	**Капитальное строение с инв. № 321/С-1723**, общей площадью **220,7 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранения, наименование – **одноэтажное здание смешанной конструкции (блоки и металлическая сетка) материального склада. Адрес:** Гомельская обл., Буда-Кошелевский р-н, г. Буда-Кошелево, ул. Техническая, 11/7, здание материального склада. **Капитальное строение с инв. № 321/С-1716**, общей площадью **245,3 кв. м,** назначение – здание специализированное коммунального хозяйства, наименование – **одноэтажное кирпичное здание материального склада с пристроенным навесом. Адрес:** Гомельская обл., Буда-Кошелевский р-н, г. Буда-Кошелево, ул. Техническая, 11/6, здание материального склада	**7 752,00**	387,60	775,20
3	**Капитальное строение с инв. № 321/С-1714**, общей площадью **459,8 кв. м,** назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **двухэтажное административное кирпичное здание.** Составные части и принадлежности: двухэтажное административное кирпичное здание с крыльцом, двумя мощениями, фонтаном (водоемом). **Адрес:** Гомельская обл., Буда-Кошелевский р-н, г. Буда-Кошелево, ул. Техническая, 11. Канализационные сети (инв. № 982). Туя брабант в кол-ве 10 шт. (инв. № 112-121). Котел стальной твердотопливный бытовой КСТБ-50 (инв. № 127). Забор кирпичный (инв. № 986)	**28 264,40**	1 413,22	2 826,44
4	**Капитальное строение с инв. № 321/С-1710**, общей площадью **218,4 кв. м,** назначение – здание специализированное для производства строительных материалов, наименование – **одноэтажное кирпичное здание арматурного цеха. Адрес:** Гомельская обл., Буда-Кошелевский р-н, г. Буда-Кошелево, ул. Техническая, 11/13, здание арматурного цеха. **Капитальное строение с инв. № 321/С-8915**, общей площадью **532,3 кв. м,** назначение – здание неустановленного назначения, наименование – **открытая бетонная кран-эстакада. Адрес:** Гомельская обл., Буда-Кошелевский р-н, г. Буда-Кошелево, ул. Техническая, 11/12, здание открытой кран-эстакады. Туалет на 2 очка (одноэтажное кирпичное здание) (инв. № 1007). **Капитальное строение с инв. № 321/С-1715**, общей площадью **16,4 кв. м,** назначение – здание неустановленного назначения, наименование – **одноэтажное кирпичное здание трансформаторной подстанции. Адрес:** Гомельская обл., Буда-Кошелевский р-н, г. Буда-Кошелево, ул. Техническая, 11/14, здание трансформаторной подстанции. Трансформатор ТМ 400-10 (инв. № 0313). Электросети с опорой ВЛ-10кВ (инв. № 848а)	**17 981,22**	899,06	1 798,12
5	**Капитальное строение с инв. № 321/С-1719**, общей площадью **365,9 кв. м,** назначение – здание специализированное для производства строительных материалов, наименование – **одноэтажное кирпичное здание столярно-механического цеха с пристроенным сараем. Адрес:** Гомельская обл., Буда-Кошелевский р-н, г. Буда-Кошелево, ул. Техническая, 11/10, здание столярно-механического цеха. **Капитальное строение с инв. № 321/С-1712**, общей площадью **518,0 кв. м,** назначение – здание неустановленного назначения, наименование – **одноэтажное кирпичное здание сборочного цеха. Адрес:** Гомельская обл., Буда-Кошелевский р-н, г. Буда-Кошелево, ул. Техническая, 11/11, здание сборочного цеха. **Капитальное строение с инв. № 321/С-1717**, общей площадью **111,9 кв. м,** назначение – здание нежилое, наименование – **одноэтажное кирпичное здание бытового помещение. Адрес:** Гомельская обл., Буда-Кошелевский р-н, г. Буда-Кошелево, ул. Техническая, 11/9, здание бытового помещения. **Капитальное строение с инв. № 321/С-1721**, общей площадью **316,1 кв. м,** назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – **одноэтажное кирпичное здание лесопильного цеха. Адрес:** Гомельская обл., Буда-Кошелевский р-н, г. Буда-Кошелево, ул. Техническая, 11/8, здание лесопильного цеха. Станок реймусовый односторонний СР 8-1 (инв. № 00287). Шкаф распределительный ЩУР-11-73708 (инв. № 879)	**28 443,00**	1 422,15	2 844,30
6	**Капитальное строение с инв. № 321/С-1932**, общей площадью **103,7 кв. м,** назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **одноэтажное кирпичное здание материального склада. Адрес:** Гомельская обл., Буда-Кошелевский р-н, г. Буда-Кошелево, ул. Техническая, 11/4, здание материального склада. **Капитальное строение с инв. № 321/С-1711**, общей площадью **1 052,1 кв. м,** назначение – здание неустановленного назначения, наименование – **одноэтажное железобетонное здание склада с гаражом. Адрес:** Гомельская обл., Буда-Кошелевский р-н, г. Буда-Кошелево, ул. Техническая, 11/3, склад с гаражом. **Капитальное строение с инв. № 321/С-12427**, общей площадью **289,1 кв. м,** назначение – здание специализированное иного назначения. **Адрес:** Гомельская обл., Буда-Кошелевский р-н, г. Буда-Кошелево, ул. Техническая, 11. Дорожное покрытие (инв. № 1008). Ограждение (забор бетонный) (инв. № 1001). Площадка для изношенных шин (инв. № 1003). Площадка для сбора металлолома (инв. № 1005). Шкаф распределительный ЩУР-7 (инв. № 880). Одноэтажное кирпичное здание проходной с автовесовой (инв. № 0438). Металлические ворота (инв. № 983а). Забор (металлическое ограждение (сетка)) (инв. № 989)	**45 592,40**	2 279,62	4 559,24
7	**Капитальное строение с инв. № 321/С-1720**, общей площадью **399,5 кв. м,** назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – **одноэтажное кирпичное здание автогаража на 25 автомашин. Адрес:** Гомельская обл., Буда-Кошелевский р-н, г. Буда-Кошелево, ул. Техническая, 11/2, здание гаража на 25 автомашин. Забор железобетонный (инв. № 985). Забор кирпичный (инв. № 1006). Беседка деревянная, размеры 2,16х 2,16х2,10 м, (инв. № 1004) – 1 шт. Дорожное покрытие (инв. № 1002)	**13 303,80**	665,19	1 330,38
8	**Шкаф ВРУ в комплекте с электросчетчиком ЦЭ 682 2** (инв. № 995)	**95,00**	4,75	9,50

Продавец: ОАО «Гомельоблстрой», г. Гомель, ул. Малайчука, 12. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.** 8 (029) 185-37-18 – управляющий в деле о банкротстве Колеснев Николай Михайлович; 8 (044) 700-40-60 – по спецтехнике и оборудованию Кучинский Владимир Александрович; 8 (044) 769-19-61, 8 (0232) 53-27-62 – по недвижимости Ярощая Людмила Николаевна. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «Гомельоблстрой»**): р/с BY73 BLBB 3012 0400 0516 9300 1001, в Головной ф-л по Гомельской области ОАО «Белинвестбанк», БИК BLBBBY2X, УНП 400051693, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 29 августа 2020 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 10 сентября 2020 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за **5 (пять) дней** до его проведения.

